УЛ. ФРУНЗЕ 10 ИН.ТУТ СОВ.СТРОИТ.И ПРАВА

Комуністычная партыя (большэвікоў) Беларусі

ЗВЯЗДА

Орган ЦК і МККП(б)Б, ЦВК і СНК БССР

№ 79 (5753) | 5 красавіка 1937 г., панядзелак | ЦАНА 10 КАП.

Пролетарыі ўсіх краін, злучайцеся!

„...Чула прыслухоўвацца да голасу мас, да голасу радавых членаў партыі, да голасу так званых „маленькіх людзей", да голасу народу".

(З заключнага слова таварыша СТАЛІНА на Пленуме ЦК ВКП(б).

ШЫРЭЙ СПАБОРНІЦТВА ЗА СТАЛІНСКІ ЎРАДЖАЙ!

Учора мы змясцілі зварот Усебеларускай нарады стаханаўцаў — перадавікоў сельскай гаспадаркі і дагавор соцыялістычнага спаборніцтва Беларускай ССР з Заходняй вобласцю.

Гэтыя два дакументы з'явіліся рэзультатам трохдзённай работы Усебеларускай нарады стаханаўцаў. У сваіх выступленнях, а таксама ў прынятых нарадай дакументах стаханаўцы ўскрылі недахопы работы зямельных органаў і калгасаў і ўзялі на сябе абавязацельствы па ўздыму ўраджайнасці ў 1937 г.

Звенявая калгаса імя Чарвякова, Мсціслаўскага раёна тав. Рыбакова Марыя гаварыла аб тым, што іх раён дрэнна падрыхтаваўся да сяўбы толькі таму, што няма належнага кіраўніцтва калгасамі з боку раённых органаў, няма дапамогі калгасам. Тав. Рыбакова прама заявіла, што кіраўнікі раёна адарваліся ад мас.

Старшыня калгаса «Трудавік» Дубровенскага раёна тав. Аўсеенка таксама зусім законна патрабаваў, каб раённыя кіраўнікі больш пікавіліся работай калгасаў, чым гэта было дагэтуль.

Сакратары акруговых і раённых камітэтаў партыі, старшыні акрвыканкомаў і райвыканкомаў, зямельныя работнікі і дырэктары МТС павінны зрабіць для сябе адпаведныя вывады з заўваг і крытыкі стаханаўцаў. Трэба цвёрда запамятаць, указанне таварыша **Сталіна** аб тым, што **«сувязь з масамі, умацаванне гэтай сувязі, гатоўнасць прыслухоўвацца да голасу мас, — вось у чым сіла і непераможнасць большэвіцкага кіраўніцтва».**

Усе раёны нашай рэспублікі ўжо распачалі палявыя работы, а ў паўднёвых раёнах разгортваецца масавая сяўба. Значыць, рэспубліка ўступіла ў самы адказнейшы перыяд правядзення веснавой пасеўнай кампаніі, у адказнейшы перыяд барацьбы за высокі ўраджай гэтага года.

Між тым большасць акруг і раёнаў дрэнна падрыхтавалася да правядзення сяўбы. Узяць хаця-б асноўныя паказальнікі падрыхтоўкі да сяўбы. Нельга-ж цярпець таго, што, напрыклад, ачыстка насення зернавых па рэспубліцы праведзена толькі на 86,8 проц., а насення ільну—на 85,9 проц. Міжкалгасны гатункаабмен выкананы толькі на 31 проц., а абмен на гатункавае насенне з дзяржаўнага фонда выкананы па зернавых на 31,5 і па ільну толькі на 17 проц.

Ганебныя лічбы і па вывазцы ўгнаення. План вывазкі гною выкананы на 27 проц. і торфу—на 37 проц. Далёка не ўсе калгасы завезлі прызначанае ім мінеральнае ўгнаенне. Няма яшчэ належнага догляду за коньмі.

Дрэнна падрыхтаваліся да веснавой сяўбы машынатрактарныя станцыі. Некаторыя дырэктары МТС несур'ёзна адносяцца да рамонту трактарнага парка, так што ў першыя дні палявых работ трактары робяць прастоі. Трактары Камарынскай МТС прастойваюць цэлымі днямі толькі з-за таго, што яны дрэнна адрамантаваны.

Полацкая МТС і зараз яшчэ не закончыла рамонту свайго трактарнага парка, дзевяць трактароў стаяць неадрамантаванымі, а дырэктар Буйноў даўно ўжо рапартаваў аб сканчэнні рамонту. Замест сур'ёзнага рамонту тут рабілі толькі прамыўку радыятараў. Гэта выяўлена толькі цяпер, калі трэба ехаць у поле.

Падобныя факты наглядаюцца і па іншых МТС. Гэта — рэзультат таго, што ні дырэктары МТС, ні Наркомзем не арганізавалі, як след, рамонт трактарнага парка, а потым па-казённаму адносяцца да прыёмкі адрамантаваных трактароў.

Патрэбна сапраўды большэвіцкая работа для таго, каб неадкладна ліквідаваць той прарыў у падрыхтоўцы да веснавой пасеўнай кампаніі, у якім апынулася наша рэспубліка. Патрэбна прыняць самыя рашучыя меры да таго, каб кожны калгас быў забяспечан добраякасным насеннем. Нельга фармальна падыходзіць да гэтай сур'ёзнай справы. Нельга дапусціць таго, каб калгасы сеялі неачышчаным і неправераным на ўсхожасць насеннем, як гэта робяць некаторыя калгасы Камарынскага раёна.

Калгаснікі і калгасніцы павінны зразумець, што пасеў недобраякасным насеннем — гэта ёсць ні што іншае, як ашуканства совецкай дзяржавы і саміх сябе, гэта ёсць злачынства перад краінай. Зусім зразумела, што дрэнная апрацоўка глебы і пасевам недобраякасным насеннем нельга павысіць ураджай, а гэта значыць нельга павялічыць і вагу працадня калгасніка. Толькі добрасумленная, часная працай на калгасных палях, добраякасным правядзеннем веснавой сяўбы і наступуючых сельскагаспадарчых работ можна дабіцца сталінскага ўраджаю і павелічэння вагі працадня калгаснікаў.

У сваім звароце стаханаўцы паставілі задачу — дабіцца ў гэтым годзе па рэспубліцы сярэдняга ўраджаю: па зернавых 90—100 пудоў з гектара, 4—5 цэнтнераў ільнавалакна і 900—1100 пудоў бульбы з гектара. За выкананне гэтай задачы трэба змагацца з усёй большэвіцкай настойлівасцю.

Ясна, што задача павышэння ўраджайнасці не можа быць вырашана адным толькі добрымі пажаданнямі і ўзяццем на сябе добрых абавязацельстваў. Трэба, каб абавязацельствы выконваліся. А ў нас ёсць нямала такіх калгасаў, якія ў пачатку яшчэ зімы ўзялі на сябе абавязацельствы аб павышэнні ўраджайнасці, а потым забыліся на іх, да сяўбы падрыхтаваліся дрэнна.

Наш правадыр і настаўнік таварыш **Сталін** вучыць: «каб стаць калгаснікам заможным, для гэтага патрэбна цяпер толькі адно — працаваць ў калгасе чэсна, правільна выкарыстоўваць трактары і машыны, правільна выкарыстоўваць рабочую жывёлу, правільна апрацоўваць зямлю, берагчы калгасную ўласнасць».

Гэтае ўказанне правадыра ні на мінуту не павінны забываць нашы калгаснікі і калгасніцы. Трэба дакладна выконваць сталінскі статут сельгасарцелі.

Велізарнейшую ўвагу трэба звярнуць на правільную арганізацыю працы, на расстаноўку людзей у брыгадах, звенях. Прапоўная дысцыпліна ў калгасах павінна быць зараз узнята, як ніколі. Рашучым чынам змагацца з малейшымі прагуламі і з поднімі выхадамі на работу. Трэба-ж зразумець, што зараз, у такі адказнейшы перыяд, дорага кожная мінута. Малейшая затрымка ў рабоце, малейшая запяжка можа прывесці да дрэнных вынікаў правядзення веснавой пасеўнай кампаніі, да паніжэння ўраджайнасці. Ні ў якім разе нельга гэтага дапускаць.

На раённыя партыйныя і совецкія арганізацыі, на зямельныя органы і машынатрактарныя станцыі ўскладаецца велізарнейшая адказнасць за правядзенне веснавой пасеўнай кампаніі. Нельга далей кіраваць калгасамі так, як было да гэтага часу. Арганізацыя канкрэтнай справы ў калгасах, у брыгадах, практычная дапамога калгаснікам, арганізацыя соцыялістычнага спаборніцтва паміж калгасамі і калгаснікамі на барацьбу за высокі ўраджай і, перш за ўсё, на лепшую падрыхтоўку, а ў паўднёвых раёнах рэспублікі на разгортванне пасеўнай пры захоўванні ўсіх правіл агратэхнікі — вось што зараз патрэбна.

Вопыт стаханаўцаў-перадавікоў высокіх ураджаяў трэба зрабіць здабыткам усіх калгасаў, усіх калгаснікаў і калгасніц. Вясковыя партыйныя арганізацыі павінны ўзначаліць соцыялістычнае спаборніцтва ў калгасах і ўсямерна пашыраць яго. Другая стаханаўская вясна павінна даць новыя тысячы выдатных людзей — стаханаўцаў высокіх ураджаяў.

Кожная раённая партыйная і совецкая арганізацыя, кожны кіраўнік раёна павінны цвёрда запамятаць, што ступень і якасць іх кіраўніцтва стаханаўцамі сельскай гаспадаркі, калгасамі будзе вымярацца не колькасцю прынятых імі пастаноў і рэзалюцый, а высокім ураджаем, мільёнамі пудоў зярна.

АБ КАНТРАКТАЦЫІ ІЛЬНУ І КАНАПЕЛЬ УРАДЖАЮ 1937 Г.

Пастанова Совета Народных Камісараў БССР і ЦК КП(б)Б

У адпаведнасці з пастановай СНК СССР і ЦК ВКП(б), аб кантрактацыі ільну і канаплі ўраджаю 1937 г.—Совет Народных Камісараў БССР і ЦК КП(б)Б — **пастанаўляюць:**

1. Зацвердзіць план кантрактацыі ільну і канаплі ўраджаю 1937 года ў калгасах (апрача здачы ільну і канаплі па натураплаце работ МТС) і адпасобных гаспадарках:

а) Ільну ручной апрацоўкі — 16000 тн. ср. № 10
б) Ільняной трасты — 108000 тн. ср. № 1,35
в) Ільнасемя — 23500 тн. у тым ліку 4500 тн. селекцыйнага і 11000 тн. таварна-сартавога
г) Пянькі-валакна — 2200 тн. ср. № 6
д) Канаплянай трасты — 2000 тн. ср. № 0,83
е) Канаплі семя — 2000 тн.

з размеркаваннем па раёнах:

(У цэнтнерах)

№№ п/п.	Назва раёнаў	Лён-валакно: Колькасць	Лён-валакно: Сярэд. №	Ільнатраста: Колькасць	Ільнатраста: Сярэд. №	Пянька: Колькасць	Пянька: Сярэд. №	Канап. траста: Колькасць	Канап. траста: Сярэд. №
1.	Асвейскі	—	—	18500	1,3	—	—	—	—
2.	Бешанковіцкі	2450	9,5	52000	1,3	120	5,5	—	—
3.	Багушэўскі	2940	10,5	17000	1,35	160	6,0	—	—
4.	Бялыніцкі	4020	10,0	2000	1,3	350	6,0	—	—
5.	Ветрынскі	290	10,5	27000	1,4	—	—	—	—
6.	Гарадоцкі	2600	11,0	27500	1,35	—	—	—	—
7.	Горацкі	420	10,5	50000	1,4	380	6,0	—	—
8.	Дрысенскі	—	—	43100	1,35	—	—	—	—
9.	Дубровенскі	9570	11,0	4000	1,4	280	6,0	—	—
10.	Дрыбінскі	3870	10,0	14000	1,3	350	6,0	—	—
11.	Круглянскі	1430	11,0	29000	1,4	270	6,0	—	—
12.	Касцюковіцкі	5810	11,0	—	—	20	6,0	4900	0,83
13.	Лёзнянскі	640	10,0	67000	1,4	—	—	—	—
14.	Лепельскі	—	—	30400	1,3	200	5,5	—	—
15.	Мсціслаўскі	790	9,5	54000	1,3	770	6,5	—	—
16.	Мехаўскі	4330	10,0	37000	1,35	—	—	—	—
17.	Магілеўскі	3900	11,0	10000	1,35	560	6,5	—	—
18.	Аршанскі	6130	11,0	14000	1,3	360	6,5	—	—
19.	Полацкі	—	—	20100	1,3	—	—	—	—
20.	Расонскі	—	—	34500	1,3	—	—	—	—
21.	Рэчыцкі	3330	9,0	—	—	540	5,5	—	—
22.	Сенненскі	570	10,5	56000	1,4	160	5,5	—	—
23.	Сіроцінскі	380	9,0	50000	1,35	—	—	—	—
24.	Суражскі	1310	10,0	58000	1,4	—	—	—	—
25.	Талочынскі	1630	10,5	26000	1,35	330	6,0	—	—
26.	Ушацкі	1160	9,5	32000	1,3	190	5,0	—	—
27.	Халопеніцкі	1100	9,0	23000	1,25	180	5,0	—	—
28.	Чавускі	1870	10,0	43000	1,4	500	6,5	—	—
29.	Чашніцкі	800	10,0	31000	1,35	140	5,0	—	—
30.	Шклоўскі	2080	11,0	64000	1,4	400	6,0	—	—
31.	Бабруйскі	2020	9,5	5000	1,3	180	6,0	—	—
32.	Барысаўскі	2430	9,5	—	—	340	6,0	—	—
33.	Б.-Кашалеўскі	2940	10,5	—	—	290	6,0	—	—
34.	Быхаўскі	3980	10,0	—	—	490	6,5	—	—
35.	Бярэзінскі	3360	9,0	—	—	430	5,5	—	—
36.	Веткаўскі	1750	10,0	—	—	110	6,0	—	—
37.	Віцебскі	2910	10,5	2000	1,3	—	—	—	—
38.	Грэскі	920	10,0	—	—	70	6,0	—	—
39.	Даманавіцкі	1530	9,0	—	—	60	6,0	3500	0,83
40.	Жлобінскі	3920	9,5	—	—	550	6,0	—	—
41.	Журавіцкі	1930	9,5	5000	1,3	280	6,0	840	0,83
42.	Крупскі	1550	9,0	10000	1,25	160	5,5	—	—
43.	Клімавіцкі	3580	9,5	—	—	660	6,0	—	—
44.	Крычаўскі	1330	10,0	13000	1,3	470	6,5	—	—
45.	Кармянскі	1020	9,0	13000	1,25	160	5,5	3500	0,83
46.	Кіраўскі	1080	9,0	10900	1,3	220	5,5	—	—
47.	Мозырскі	1220	8,5	—	—	280	6,0	1680	0,83
48.	Пухавіцкі	480	10,0	8000	1,4	180	5,5	—	—
49.	Рудзенскі	1520	10,5	8000	1,35	200	6,0	—	—
50.	Рагачоўскі	1220	10,0	12000	1,3	450	6,5	—	—
51.	Слуцкі	1490	11,0	—	—	80	6,0	—	—
52.	Свяцілавіцкі	1620	9,0	—	—	180	6,0	—	—
53.	Урававіцкі	190	10,0	15000	1,35	210	6,0	—	—
54.	Хоцімскі	930	10,0	16000	1,35	320	6,5	840	0,83
55.	Хойніцкі	1860	9,5	—	—	540	6,0	—	—
56.	Церахоўскі	480	9,5	12000	1,35	180	6,0	—	—
57.	Чырвонапольскі	860	9,5	14000	1,25	400	6,5	1400	0,83
58.	Асіпавіцкі	1890	9,5	—	—	210	6,0	—	—
59.	Брагінскі	2470	10,0	—	—	340	6,0	—	—
60.	Багомльскі	1080	9,0	—	—	190	5,0	—	—
61.	Гомельскі	750	9,0	—	—	90	6,0	—	—
62.	Глускі	2170	9,0	—	—	470	6,0	—	—
63.	Дзержынскі	1750	10,5	—	—	90	6,0	—	—
64.	Добрушскі	900	9,0	2000	1,25	80	5,0	—	—
65.	Ельскі	810	8,5	—	—	280	5,5	—	—
66.	Жыткавіцкі	630	8,5	—	—	140	6,0	—	—
67.	Заслаўскі	1380	10,0	—	—	120	6,0	—	—
68.	Камарынскі	780	8,5	—	—	670	6,5	—	—
69.	Клічаўскі	2080	9,5	—	—	330	6,0	—	—
70.	Копыльскі	2150	11,5	—	—	90	6,0	—	—
71.	Капаткевіцкі	900	8,5	—	—	250	5,5	—	—
72.	Лагойскі	1310	9,0	—	—	240	6,0	—	—
73.	Лельчыцкі	580	9,0	—	—	230	5,5	—	—
74.	Лоеўскі	1630	9,5	—	—	380	5,5	—	—
75.	Любаньскі	1060	10,0	—	—	160	6,0	2500	0,83
76.	Менскі	1070	10,5	—	—	90	6,0	—	—
77.	Нараўлянскі	640	8,5	—	—	280	5,5	—	—
78.	Парыцкі	2410	9,5	—	—	420	6,0	—	—
79.	Плешчаніцкі	1040	9,0	—	—	200	5,0	—	—
80.	Прапойскі	1920	10,0	—	—	450	6,5	—	—
81.	Петрыкаўскі	740	8,5	—	—	220	5,5	—	—
82.	Смалявіцкі	2520	10,0	—	—	270	6,0	—	—
83.	Ст.-Дарожскі	1850	9,0	—	—	150	6,0	—	—
84.	Старобінскі	1380	11,0	—	—	220	6,0	—	—
85.	Тураўскі	500	10,0	—	—	160	6,0	—	—
86.	Уадзенскі	1160	10,0	—	—	90	6,0	—	—
87.	Чаўарскі	2310	10,0	—	—	290	6,0	840	0,83
88.	Чырвонаслабод.	1190	11,0	—	—	110	6,0	—	—
89.	Чэрвеньскі	2520	9,5	—	—	250	6,0	—	—
90.	Чэрыкаўскі	2820	10,5	—	—	690	6,5	—	—
	УСЯГО па БССР:	160000	10,0	1080.000	1,35	22000	6,0	2000	0,83

Назва раёнаў	Ільнасемя: Усяго	У тым ліку: Селекцыйнага	У тым ліку: Таварна-сартавога	Канаплі
Асвейскі	1700	—	1400	—
Бешанковіцкі	5700	—	4900	110
Багушэўскі	3000	—	2800	140
Бялыніцкі	2800	—	1500	290
Ветрынскі	2600	—	2600	—
Гарадоцкі	6700	3350	3350	—
Горацкі	9200	5250	3950	320
Дрысенскі	6950	3750	3200	—
Дубровенскі	7250	—	7250	240
Дрыбінскі	3500	—	3500	300
Круглянскі	3850	—	3350	220
Касцюковіцкі	3230	—	2400	590
Лёзнянскі	10600	4500	6100	—
Лепельскі	4700	3100	1600	150
Мсціслаўскі	9150	5250	3900	610
Мехаўскі	4800	—	4500	—
Магілеўскі	3000	—	2080	440
Аршанскі	5170	—	5170	290
Полацкі	2000	—	700	—
Расонскі	3200	—	3200	—
Рэчыцкі	4100	2200	—	440
Сенненскі	5000	—	5000	130
Сіроцінскі	8200	3800	4400	—
Суражскі	6700	—	6700	—
Талачынскі	7100	3800	3300	270
Ушацкі	3300	—	2200	180
Халопеніцкі	2900	—	1900	150
Чавускі	5100	—	2500	410
Чашніцкі	3600	—	2000	120
Шклоўскі	10650	4850	5800	330
Бабруйскі	1590	—	—	140
Барысаўскі	1700	—	—	280
Б.-Кашалеўскі	1700	—	—	230
Быхаўскі	2000	—	—	400
Бярэзінскі	2160	—	—	360
Веткаўскі	1250	—	—	100
Віцебскі	2150	—	1750	—
Грэскі	720	—	—	60
Даманавіцкі	1450	—	—	430
Жлобінскі	1400	—	—	450
Журавіцкі	1750	—	1600	330
Крупскі	1100	—	—	180
Клімавіцкі	1380	—	—	560
Крычаўскі	1500	—	1500	390
Кармянскі	1350	—	—	540
Кіраўскі	1300	—	—	180
Мозырскі	1100	—	—	60
Пухавіцкі	1300	—	—	150
Смілавіцкі	1900	—	—	170
Рагачоўскі	1400	—	—	370
Слуцкі	2900	2400	—	60
Свяцілавіцкі	1200	—	—	140
Урававіцкі	4000	2750	—	170
Хоцімскі	2400	—	—	360
Хойніцкі	1330	—	—	450
Церахоўскі	1400	—	—	150
Чырвонапольскі	1600	—	—	480
Асіпавіцкі	1400	—	—	180
Брагінскі	1650	—	—	280
Багомльскі	1000	—	1000	150
Гомельскі	500	—	—	70
Глускі	1670	—	—	380
Дзержынскі	1400	—	1400	80
Добрушскі	650	—	—	60
Ельскі	800	—	—	230
Жыткавіцкі	520	—	—	120
Заслаўскі	1080	—	—	100
Камарынскі	600	—	—	560
Клічаўскі	1150	—	—	270
Копыльскі	1490	—	—	80
Капаткевіцкі	750	—	—	200
Лагойскі	1000	—	—	190
Лельчыцкі	600	—	—	190
Лоеўскі	1250	—	—	310
Любаньскі	830	—	—	420
Менскі	650	—	—	70
Нараўлянскі	620	—	—	220
Парыцкі	1450	—	—	350
Плешчаніцкі	700	—	—	160
Прапойскі	1130	—	—	360
Петрыкаўскі	740	—	—	180
Смалявіцкі	1500	—	—	220
Ст.-Дарожскі	1320	—	—	120
Старобінскі	1040	—	—	180
Тураўскі	500	—	—	130
Уадзенскі	1000	—	—	80
Чаўарскі	1100	—	—	330
Чырвонаслабодскі	830	—	—	90
Чэрвеньскі	1800	—	—	210
Чэрыкаўскі	1500	—	1500	550
Усяго па БССР:	235000	45000	110.000	20.000

2. Захаваць у сіле ўмовы кантрактацыі ільну і канаплі на 1937 г., устаноўленыя пастановай СНК БССР і ЦК КП(б)Б ад 8/IV-1936 года «Аб кантрактацыі ільну і канаплі ўраджаю 1936 г.».

Устанавіць, што прэміі-надбаўкі за здадзенае звыш плана ільнасемя і канаплі выплачваецца калгасам (за выключэннем насеннаводных) пры ўмове засыпкі імі поўнасцю насенфондаў.

3. Зняць з калгасаў і адпасобных гаспадарак па ўсіх раёнах БССР нядоімкі, якія лічацца за імі па кантрактацыі прадукцыі ільну ўраджаю 1936 г., адтэрміноўваўшы запазычанасць гэтых гаспадарак па выдадзеных грашовых авансах па кантрактацыі ільну і ільнасемені з ураджаю 1936 г. да 15 лістапада 1937 года.

4. Даручыць Упаўкамзаг СНК СССР па БССР у двухзённы тэрмін размеркаваць трасту ільну і канаплі па заводах.

Старшыня СНК БССР М. ГАЛАДЗЕД.
Сакратар ЦК КП(б)Б ШАРАНГОВІЧ.

Гор. Менск,
1 красавіка 1937 г.

Будаўніцтва аўтамагістралі Масква—Менск

Прыехаўшы ў Менск начальнік будаўніцтва аўтамагістралі Масква—Менск тав. Пятровіч у гутарцы з супрацоўнікам «Звязды» паведаміў:

— У другой палове красавіка на трасе аўтамагістралі Масква—Менск пачнуцца асноўныя работы, спыненыя ўвосень мінулага года. На працягу ўсёй зімы будаўнікі займаліся загатоўкай пяску, гравія і камення, патрэбных будаўніцтву ў мільёнах кубаметраў.

За 1936 год земляное палатно трасы закончана на 85 проц. Найбольш сур'ёзныя штучныя пабудовы, як масты праз рэкі Днепр, Бярэзіна, Сха і Воп ужо гатовы.

У гэтым годзе штучныя пабудовы — жалезабетонныя трубы, земляное палатно ўпершыню выпрабавалі дзеянне паводкі. Выпрабаванне вытрымана з гонарам, што сведчыць аб надрэннай якасці праведзеных работ.

Пяпер ідзе падрыхтоўка да развароту кладкі бетону на ўсіх штучных пабудовах. Адначасова пачнуцца работы па машчэнню, у першую чаргу на тэрыторыі БССР.

М. КІН.

Тав. Пацёмкін В. П.—першы намеснік народнага камісара па замежных справах

Прэзідыум Цэнтральнага Выканаўчага Камітэта СССР **пастанавіў:** зацвердзіць тав. **Пацёміна** Уладзіміра Петровіча першым намеснікам народнага камісара па замежных справах.

Пастановай прэзідыума ЦВК Саюза ССР тав. **Пацёмкін** В. П. вызвалены ад абавязкаў паўнамочнага прадстаўніка СССР ва Францыі.

Паведамленні аб кантролі на іспанскіх граніцах

ЛОНДАН (сталіца Англіі), 4 красавіка. (БЕЛТА). Як паведамляе агенцтва Рэйтар, кантроль на сухапутных граніцах Іспаніі і на моры будзе ўведзен у дзеянне 10 красавіка. Англійскія кантралёры ўжо знаходзяцца на іспанска-партугальскай граніцы. Выказваецца пажаданне, каб усе падрыхтаванні, у тым ліку і на франка-іспанскай граніцы, былі закончаны такім чынам, каб кантроль на сушы і на моры быў уведзен у дзеянне на ўсіх граніцах адначасова.

ПАРЫЖ (сталіца Францыі). Ва французскіх афіцыяльных колах сцвярджаюць, што пасля ўвядзення ў дзеянне сістэмы кантролю іспанскіх граніц на сушы і на моры пачнецца абмеркаванне «ўсіх асноватніх праблем», у першую чаргу праблемы адклікання з Іспаніі іншаземных добраахвотнікаў.

ПОЛАЦКАЯ АКРУГА НЕ ГАТОВА ДА СЯЎБЫ

Рад калгасаў Полацкай акругі ўжо выйшаў у поле. Калгас «Кастрычнік» Ветрынскага раёна ўзараў 15 гектараў. Распачалі ворыва калгасы імя Гікало (Ветрынскі раён), імя Кірава (Полацкі раён), «Чырвоныя Канашы» (Расонскі раён) і іншыя. Калгасы Тураўлянскага сельсовета Ветрынскага раёна распачалі баранаванне зяблёва.

Палявыя работы пачаліся. Праз некалькі дзён пачнецца сяўба. Аднак, большасць калгасаў акругі яшчэ не гатова да гэтай важнейшай кампаніі. Кіраўнікі Полацкага, Асвейскага і Расонскага раёнаў падрыхтоўку да веснавой сяўбы пусцілі на самацёк. Самаазасакоенасць і бестурботнасць пануюць у земляўдзелах гэтых раёнаў.

Трактарны парк Полацкай МТС не гатоў да выхаду у поле. Дырэктар МТС тав. Буйноў замест большэвіцкай арганізацыі рамонту машын займаўся лагэдуль бессаромным вочкаўцірацельствам. Ён даў весткі аб поўным выкананні плана рамонту трактароў, а на справе 9 трактароў і сёння яшчэ не адрамантаваны, прыпэпны інвентар стаіць нясправны ў гразі на дварэ МТС.

МТС не закончыла заключэнне дагавораў з калгасамі, і з 83 заключана толькі 35. Да 31 сакавіка не былі ўкамплектаваны трактарныя брыгады, за брыгадамі не замацаваны ўчасткі. Трактары не забяспечаны неабходнымі інструментамі, вёдрамі, лямпкамі для начной работы.

Не менш сур'ёзнае становішча з падрыхтоўкай да сяўбы калгасаў Полацкага раёна. У калгасах «Атказ інтэрвентам», «Беларуская вёска», імя Кірава Домнікаўскага сельсовета яшчэ не адрамантаваны інвентар і збруя. Не вывозіцца ўгнаенне на поле. Коні дрэнна даглядаюцца, не забяспечаны на час сяўбы добраякаснымі кармамі.

Рамонт інвентару, вывазка гною, загатоўка і вывазка торфу зрываецца па ўсяму Полацкаму раёну. План рамонту інвентару Полацкім раёнам выкананы на 82,6 проц., план вывазкі гною — на 33,9 проц., торфу — на 17,9 проц.

Не лепш справа і з падрыхтоўкай насення. У часе паўторнай прадпасеўнай праверкі насення-кантрольнай лабараторыі насенне дзесяці калгасаў аказалася некандыцыйным па чыстаце, і 21 калгаса — некандыцыйным па ўсхожасці. Ячмень і авёс калгаса «Другая большэвіцкая вясна», напрыклад, мае 15 проц. пустазелля. Далёка не скончан абмен насення на гатункавае.

Полацкі райземаддзел не ўзначальвае, не арганізуе падрыхтоўку да сяўбы. Аграномы заседжваюцца ў раёнах, з калгасаў збіраюцца толькі зводкі.

Дрысенскі раён не закончыў рамонт інвентару. Усяго на 17 проц. выкананы план вывазкі гною. Калгасы імя Чарвякова, «Чырвоная горка» Юзафоўскага сельсовета не забяспечаны насеннем.

У Асвейскім раёне план вывазкі гною выкананы на 25 проц., торфу — на 21 проц. Увогуле па акрузе, не гледзячы на вялікія запасы торфу і на ўсе ўмовы для скарыстання гэтага каштоўнейшага ўгнаення, план загатоўкі і вывазкі торфу выкананы толькі на 25,4 проц. На столькі-ж процантаў выкананы план вывазкі гною.

Такое трывожнае становішча з падрыхтоўкай да сяўбы стварылася ў выніку слабай работы акруговага зямельнага аддзела і акрвыканкома. Яны многа склікалі нарад, занадта захапляліся гаварыльняй і не звярталі ўвагі на выкананне ўзятых абавязацельстваў у калгасах.

Т. ЛЯСОВІЧ,
Е. ТРУШЧАНКА.

ЗАХАПІЛІСЯ СЯРЭДНІМІ ЛІЧБАМІ

Калі прагледзець сярэднія лічбы забяспечанасці Аршанскага раёна насенным матэрыялам да веснавой сяўбы, ствараецца ўражанне, што ўсё ў парадку. А сапраўднае становішча паказвае, што раён не падрыхтаваўся да сяўбы, не забяспечан насеннем.

18 калгасаў раёна яшчэ не маюць дастаткова насення збожжавых культур. У калгасе «Ленінскі заклік» Браздзечанскага сельсовета нехапае 100 цэнтнераў насення, у калгасе «Зара» Веравейшанскага сельсовета — 50 цэнтнераў, а ў калгасе «Авангард» Пугляеўскага сельсовета не хапае 140 цэнтнераў і т. д.

Чаму ў гэтых калгасах такі вялікі недахоп насення? Тлумачыцца гэта тым, што пералічаныя калгасы дапусцілі велізарныя страты пры ўборцы мінулага года, дапушчаны раскрадванне калгаснага дабра і грубейшыя парушэнні статута сельскагаспадарчай арцелі.

Ужо даўно загалчык Аршанскага райземаддзела тав. Касцюкевіч даў весткі ў Наркомзем, што план засыпкі канюшыны выкананы на 103,7 проц. Але гэта толькі сярэдняя лічба. У сапраўднасці-ж у 50 калгасах раёна яшчэ не хапае канюшыны на пасеў 1.000 гектараў.

Пачаліся палявыя работы. Трэба было неадкладна мабілізаваць усе ўнутраныя рэсурсы, арганізаваць узаемапамогу паміж калгасамі. У Оршы-ж з гэтым не спяшаюцца.

У раёне далёка не закончана выкананне плана дзяржаўнага гатункаабмену, а план міжкалгаснага гатункаабмену ганебна зрываецца. Замест 1.032 тоны абменена толькі 488 тон.

Далёка не выкананы план вывазкі розных відаў мясцовых угнаенняў. У Гальцаўскім, Смалянскім, Якаўлевіцкім, Машкаўскім, Межаўскім і інш. сельсоветах сарвана вывазка гною і торфу, збор попелу і штушынага памёту.

Райком КП(б)Б і райвыканком разгубілі стаханаўцаў сельскай гаспадаркі, а іх у раёне не мала. Сакратар РК КП(б)Б тав. Леановіч вымушан прызнаць, што за зімовы перыяд ніякай работы са стаханаўцамі не праводзілі.

У Оршы супакоіліся. Ні райком КП(б)Б (сакратары Соскін, Леановіч), ні райвыканком (старшыня Сцяпанаў) не адчуваюць адказнасці за чёс веснавой сяўбы.

І. ШЛЯФЕР.

ДЗЕ НАМ СЕЯЦЬ?

У нашым Свірыдаўскім сельсавеце, Рэчыцкага раёна, даўно ўжо ўстанавіліся добрае, цёплае надвор'е. Зямля прасыхае. Калгасы ва ўсю разгарнулі палявыя работы, пачалі сяўбу ячменю. А мы, 14 адпасобнікаў пасёлкаў Заводнае, Бяроза і Арол, хозяін, заклаўшы рукі ў кішэні, і не ведзем што нам рабіць, дзе нам сеяць.

У чэрвені мінулага года каморнік адбіў межы калгаснай зямлі, а пра нас, адпасобнікаў, ніхто тады не падумаў. Калі мы звярнуліся да старшыні сельсовета з просьбай адвесці нам зямлю, ён адказаў нас у райземаддзел. Земаддзел-жа пасылае нас зноў у сельсавет, а апошні ў праўленне калгаса імя 17-годзе Кастрычніка. Так мы бясконца блукаем з адной установы ў другую і нідзе не можам атрымаць адказу на наша пытанне: дзе нам сеяць?

Адпасобнікі: **Н

СПРАВАЗДАЧНА-ВЫБАРЧЫЯ СХОДЫ ПЯРВІЧНЫХ ПАРТЫЙНЫХ АРГАНІЗАЦЫЙ

АБУРАЮЧАЯ ЗАПУШЧАНАСЦЬ

Справаздачна-выбарчы сход партыйнай арганізацыі барысаўскага фанернага завода № 25 «Чырвоная Бярэзіна» паказаў абураючую запушчанасць партыйна-выхаваўчай работы сярод комуністаў і беспартыйных мас.

Агітацыйная работа ў пэхах праводзіцца наскокам. Больш таго, уся трэцяя начная змена фанернага завода і пэх шырспажыву не ахоплены зусім агітацыяй. Якасць агітацыі нізкая. Агітатар т. Бярэцоўскі гаворыць, што з 50 рабочых фанернага пэха на гутарках прысутнічае толькі 25 чалавек. Тое-ж самае і ў другіх пэхах. Партком вылучыў агітатараў з нізкім партыйным узроўнем, а сам сакратар парткома Зевенаў, дырэктар завода Розенберг не лічаць сваім абавязкам даводзіць лозунгі партыі да рабочых мас. Больш таго, Розенберг заявіў: «Я ў масы не пайду агітаваць». Заўком Шабун у сваю чаргу рэдка заглядае ў цэх.

Аб адсутнасці палітычна-выхаваўчай работы гаворыць такі недапушчальны факт: на фанерным заводзе № 25 ёсць 600 рабочых, а членаў саюза—350. Астатнія не ахоплены членствам. Яшчэ горш, што ў заўкоме завода некалькі год ляжаць больш 100 заяў рабочых аб жаданні ўступіць у саюз. Работнікі заўкома (яго старшыня Шабун) згубілі большэвіцкае чуццё і ператварыліся ў заядлых бюракратаў, рабочыя не ведаюць, што здарылася з іх заявамі.

Аб дзейнасці класавых ворагаў гаворыць такі факт. Лепшых стаханаўцаў-комуністаў Жукоўскую і Міхневіч, якія сістэматычна перавыконваюць вытворчы план, свядома хацелі абвінаваціць у зрыве стаханаўскага руху і ў шкодніцтве. А наіўныя кіраўнікі парткома і дырэктар завода не разглядзелі дзейнасці класавага ворага. Яны сваімі паводзінамі садзейнічалі дыскредытацыі стаханаўцаў-комуністаў. Справа дайшла да таго, што на парткоме ставілі пытанне аб прабыванні Жукоўскай у радах партыі.

Такія метады «выхавання» выкарыстаў класавы вораг. Неабходна напомніць, што на фанзаводзе арудавала доўгі час трацкісцкая група, якая выкрыта (Сівайскі, Незаконаў, Ратнер). Яны выключаны з партыі. Але няма ніякага сумнення, што іх паслядышы асталіся.

У партыйнай арганізацыі яшчэ не створана спрыяючая атмасфера для разгортвання самакрытыкі і невыпадкова на сходзе комуністы абыходзілі, выгараджвалі райком. Яны баяцца загаварыць на ўвесь голас аб недахопах унутрыпартыйнай работы.

Яркім прыкладам, які сведчыць аб баязні крытыкавань, з'яўляецца выступленне комуніста т. Кепіна. Ён гаварыў што быў тры разы ў райкоме па хвалюючых яго пытаннях і не мог атрымаць адказу. Між тым ён усяляк не хацеў гаварыць аб тым, да каго ён звяртаўся ў райкоме, і калі сход настойліва спытаў яго, да каго ён хацеў папасці на прыём, Кепін заявіў: «Вы самі павінны ведаць, да каго нельга папасці радавому комуністу». Сход дагадаўся, што справа ідзе аб сакратару райкома т. Майсееве.

Выбарчыя сходы Барысаўскай партарганізацыі толькі пачынаюцца. Райком павінен улічыць урокі першых дзён і ўзначаліць разгортванне большэвіцкай самакрытыкі.

АСТАПЕНКА.

КРЫТЫКА НЕ РАЗГОРНУТА

25—26 сакавіка ў інстытуце гісторыі партыі праходзіў партыйны сход па выніках Пленума ЦК ВКП(б). Калі ў першы дзень спрэчак комуністы прабавалі крытыкаваць работу інстытута, дырэктар інстытута Пасэ сваімі рэплікамі ўдзейнічаў на паніжэнне агульнага тону крытыкі, і вастрыня выступленняў у другі дзень схода была прыніжана. Крытыкавалі наогул, не называючы канкрэтных імён.

Гэты факт не выпадковы. Ён з'яўляецца прамым разультатам таго, што ў партыйнай арганізацыі інстытута гісторыі партыі большэвіцкая крытыка і самакрытыка не ў пашаце. І агульны сход партыйнай арганізацыі па справаздачы парткома, які пачаўся 2 красавіка, праходзіць зусім на нізкім палітычным узроўні.

З таго факту, што з выпушчанай інстытутам прадукцыі ў пяцігоддзі мінулым 50 проц. было із'ята, як контррэволюцыйная, трацкісцкая, што ў інстытуце доўгі час знаходзіліся прамыя ворагі народа і што ўся КП(б)Б прад'яўляе вялікі рахунак інстытуту, які да гэтага часу не даў неабходных дапаможнікаў па вывучэнню гісторыі КП(б)Б, партыйная арганізацыя не зрабіла неабходных вываадаў.

Спрэчкі па справаздачы парткома, як і сам даклад сакратара, не выкрылі ўсіх тых недахопаў, якія маюць месца ў інстытуце. Асобныя імкненні членаў партыі крытыкаваць работу кіраўніцтва інстытута, партыйнай арганізацыі і на гэтым сходзе зноў прыніжаюцца «ветлівымі» рэплікамі Пасэ.

Партыйны сход не даў адпору тав. Пасэ, які не зразумеў сутнасці ўказанняў Пленума ЦК ВКП(б) і даклада таварыша Сталіна аб перабудове ўнутрыпартыйнай работы.

Партарганізацыя інстытута, якая складаецца з членаў партыі, закліканых весці работу на ідэалагічным фронце, павінна была паказаць прыклад пастаноўкі партыйнай работы, але, на жаль, гэтага няма.

Сход яшчэ не скончыўся, і партыйная арганізацыя мае ўсе магчымасці выправіць памылкі першых дзён схода і правесці яго на прынцыповай палітычнай вышыні.

Р. Ц.

Рабочыя менскага станкабудаўнічага завода імя Кірава глыбока вывучаюць даклад таварыша Сталіна на Пленуме ЦК ВКП(б) НА ЗДЫМКУ: агітатар тав. Кацовіч чытае рабочым новага механічнага цэха заключнае слова таварыша Сталіна на Пленуме ЦК ВКП(б).

Фото Я. Салавейчыка.

У ПАЛОНЕ ПАДХАЛІМСТВА І ЎГОДНІЦТВА

У Наркамаце аховы здароўя БССР у мінулым палівзаліся і тварылі свае справы такія ад'яўленыя ворагі народа, як Олікер і інш. Карэнні іх не выкарчаваны яшчэ да гэтага часу. Аб гэтым сведчыць наяўнасць раду фактаў шкодніцтва ў сістэме Наркамата аховы здароўя. Большасць будоўляў, якія пачаты ў ажыццяўленне закона аб забароне абортаў, не скончаны к тэрміну, а скончаныя не зданы ў эксплаатацыю. Будаўніцтва менскага радзільнага дома скончана яшчэ да 8 сакавіка, але на сёнешні дзень ён не выкарыстоўваецца, а рожаніцы вымушаны ляжаць у карыдорах. Такіх фактаў не мала.

Партыйная арганізацыя да гэтага часу не зварачвала ўвагу на гэтыя і рад ім падобных фактаў. Чынапачытанне, падхалімства і ўгодніцтва абвалаквалі партыйную арганізацыю, і гэтым карыстаўся класавы вораг.

Аб працвітанні падхалімства дастаткова прывесці такі прыклад. Да міжнароднага жаночага дня 8 сакавіка ў насценгазеце наркамата быў змешчан артыкул яўна падхалімскага зместу, у якім усхваляліся комуністы, начальнікі кіраўніцтваў наркамата таго, што, моў, «хто не ведае нашу гераіню Суркову»... «Пад кіраўніцтвам і дзякуючы сакратара парткома Камянецкай, зам. наркома Нейштат, наркома Бурачэўскага ў нас у БССР дасягнутыя такія поспехі ў галіне аховы здароўя...» і т. д.

У спрэчках па справаздачы сакратара парткома комуністы вельмі многа гаварылі аб дрэннай рабоце кандыдата партыі — начальніка кіраўніцтва навукі і кадраў — Гранава. Але дрэнная работа Гранава зусім не перашкодзіла парткому зусім нядбайна выліць яму выдатную характарыстыку.

Партыйная арганізацыя не ўзначаліла барацьбу з бюракратызмам у апараце. Сотні скаргаў працоўных, асабліва ў лячэбным кіраўніцтве, ляжаць без увагі і рэагавання. Алказы жалабшчыкам часта фармальныя. Зусім нядаўна член партыі—начальнік ясельнага кіраўніцтва Кантаровіч грубым чынам выгнала з свайго габінета наведвальніцу Шэндараву.

Гэтыя і ім падобныя факты не былі ўзяты пад увагу ўсёй партарганізацыяй. Толькі зараз на справаздачным сходзе аб гэтым загаварылі і то няпоўным голасам. Сёй-той яшчэ кіруецца старымі неўласцівымі большэвізму прынцыпамі: не сварыцца, жыць мірна.

Былы сакратар парткома т. Пархоменка у сваім выступленні не раскрытыкаваў сваю работу і работу парткома, не ўскрыў усіх тых агіднасцей, якія тварыліся ў арганізацыі, а наадварот, імкнуўся гаварыць сходу аб сваіх нібыта заслугах.

Комуністы Шлейфер, Пасюкоў, Давыдовіч і інш. у сваіх выступленнях гаварылі аб запушчанасці ўнутрыпартыйнай работы. Асабліва дрэнна арганізавана партыйная вучоба. Заняткі часта зрываюцца. Прапагандыст Пархоменка праводзіць заняткі не цікава, нудна. Пытанні слухачам ставяцца так, што ім толькі прыходзіцца адказваць: «так» або «не». Ёсць фармалізм, адсутнічае ўвязка гісторыі з сучаснасцю, не прымяняецца мастацкая літаратура. Партком не цікавіўся як вучыцца кожны комуніст.

Партыйная арганізацыя адгарадзілася сцяною ад беспартыйных работнікаў наркамата. Апрача сходаў, якія склікаюцца па спецыяльна ўрачыстых, або кампанейскіх пытаннях, ніякай работы не вядзецца. Аб палітычнай агітацыі і не падумалі. У партарганізацыі ёсць толькі адзін спачуваючы, і то пераведзены пры чыстцы 1933 года.

У сваіх выступленнях комуністы гаварылі і аб тым, што нарком аховы здароўя Бурачэўскі не звязан з імі, дрэнна кіруе. Нават часта бывае цяжка папасці да яго на прыём.

Спрэчкі па дакладу парткома яшчэ не выкрылі ўсіх тых агіднасцей, якія маюць месца ў арганізацыі Наркамата аховы здароўя і яго сістэмы, і якія ствараюць глебу для дзеянняў класавых ворагаў.

Ц. ФРЫД.

У ПАРТЫЙНЫХ АРГАНІЗАЦЫЯХ

МАГІЛЕЎ

У магілеўскай партарганізацыі справаздачна-выбарчыя сходы пачаліся ў 12 пярвічных партарганізацыях. Па справаздачных дакладах сакратароў парткома ў першыя дні комуністы амаль не крытыкавалі работу парткомаў і райкома партыі.

У партарганізацыі цукерачнай фабрыкі ў першы дзень справаздачнага схода крытыкі і самакрытыкі амаль не было. Толькі пасля абмеркавання даклада таварыша Сталіна комуністы гэтай арганізацыі паўторна выступалі і ўскрывалі рад абураючых фактаў дрэннай работы парткома. Комуністы расказвалі, што работай парткома кіраваў не сакратар парткома Пеўзнер, а дырэктар Белявіцкі, які моцна трымаў усіх комуністаў у сваіх адміністратыўных руках. Комуніст Юдкевіч расказваў аб яўным заціску крытыкі з боку тэхдырэктара фабрыкі. Апошні на сходзе стаханаўцаў выступаў з патрабаваннем прыцягнуць да суровай адказнасці Юдкевіча за крытыку недахопаў у рабоце інжынера. На гэтым сходзе прысутнічалі сакратар парткома, старшыня фабкома і дырэктар фабрыкі і ніхто з іх не рэагаваў на факт грубага заціску крытыкі.

Не гледзячы на тое, што пасля некаторай раскачкі разгарнулася крытыка на справаздачна-выбарчых партсходах, усё-ж поўным голасам аб недахопах загаварылі не ўсе комуністы. Характарным з'яўляецца тое, што комуністы ад станка куды вастрэй крытыкуюць слабыя месцы ў рабоце, чым кіруючыя комуністы. Аб тым, што не ўсе комуністы зразумелі гістарычнае рашэнне Пленума ЦК ВКП(б) сведчыць такі факт. На партсходзе цукерачнай фабрыкі пры вылучэнні кандыдатур у спісы для тайнага галасавання кандыдат партыі тав. Міркіна задала прэзідыуму пытанне: «Ці можна абіраць у партком радавых комуністаў?»

ГОРКІ

Сход партарганізацыі Горацкага сельскагаспадарчага інстытута прайшоў на нізкім ідэйна-палітычным узроўні. У першы дзень справаздачна-выбарчага схода праявілася недыскуцыпліванасць многіх комуністаў. Сход пачаўся са спазненнем на 35 мінут. Справаздача сакратара парткома была дзяляцкая. У гэтым дакладзе не было крытыкі работы партыйнага камітэта, райкома партыі.

Пасля даклада пачаліся спрэчкі. Хоць у спрэчках запісалася 50 прамоўцаў, але па характару спрэчкі адказвалі тону даклада. Больш усяго гаварылі аб білетах у тэатр, гаварылі аб тым, што дырэктару інстытута на святы нясуць прадукты з магазінаў. Вышэй гэтых абывацельскіх размоў не ўзняліся.

КАПАТКЕВІЧЫ

Справаздачна-выбарчыя партсходы пачаліся з 25 сакавіка. У партарганізацыі Чалюшчавіцкага сельсовета дапушчаны парушэнні ўказанняў ЦК ВКП(б) аб арганізацыі выбараў. Пры тайным галасаванні прысутнічалі кандыдаты партыі, прычым сход запятнуўся да 3 гадзін ночы.

Важна адзначыць тое, што такія комуністы як тт. Сарочын, Прудкіх, Мацкевіч, Прончак, Невяроўскі, Насуковіч, раней амаль ніколі не выступалі на сходах. Гэтыя-ж комуністы па справаздачных дакладах выступалі з вострай крытыкай работы парторга і райкома партыі.

САКРАТАР ПАРТКОМА НЕ МАБІЛІЗАВАЎ КОМУНІСТАЎ НА ПАВЫШЭННЕ ПІЛЬНАСЦІ

Доўгі час на мазырскім фанерным заводзе «Чырвоны Кастрычнік» арудвалі трацкісты Мінцін, Вайсман, Вінакур і інш. Прыкрываючыся партыйнымі білетамі, гэтыя ворагі народу праводзілі шкодніцкую работу. Але партыйная арганізацыя не магла распазнаць і выкрыць ворагаў. Яны былі выкрыты ў часе праверкі і абмену партдакументаў праз галаву партарганізацыі.

Прычына гэтаму — адсутнасць у арганізацыі вострай большэвіцкай крытыкі і самакрытыкі з аднаго боку і наяўнасць сямейственасці, кругавой парукі, палітычнага ратэйства і слепаты—з другога. У аснове усіх гэтых прычын крыецца зусім нізкі ідэйны ўзровень партыйнай работы.

Усё гэта вымагала ад сакратара парткома Елепкага пабудаваць свой справаздачны даклад на сходзе, каб ён быў палітычна завостраным, самакрытычным і мабілізуючым комуністаў па разгортванне большэвіцкай крытыкі і самакрытыкі на павышэнне рэволюцыйнай пільнасці. Але Елепкі, відаць, не зразумеў сутнасці рашэнняў Пленума ЦК ВКП(б) аб перабудове партыйнай работы. Таму не выпадкова ў сваім дакладзе ён не сказаў ні слова аб грубых парушэннях у арганізацыі статута партыі і толькі мімаходам закрануў парушэнне ўнутрыпартыйнай дэмакратыі. Ён умаўчаў і аб тым, што на заводзе доўгі час існавалі пэхавыя партгрупы, у той час, як заводская партарганізацыя налічвае ўсяго 22 члены і 11 кандыдатаў партыі. Гэта грубае парушэнне партыйнага статута прывяло да адрыву парткома ад комуністаў. Сакратар парткома перастаў асабіста займацца ўсебаковым вывучэннем кожнага комуніста. І таму ён не ведаў настрояў і патрабаванняў іх, а таксама прычын слабой актыўнасці.

На такім-жа нізкім ідэйным узроўні праходзілі спрэчкі па дакладу. Выступалі амаль усе комуністы. Але большасць выступленняў насіла вузка-дзяляцкі характар. Асабліва яркі праявілася гэта дзяляцтва ў выступленні дырэктара завода Вазнясенскага. Ён гаварыў больш чым поўгадзіны, але аб партыйнай рабоце амаль нічога не сказаў. Яго прамова была поўна пералічэнняў вытворчых непаладкаў і абвінавачванняў у гэтым комуністаў. Аб тым, што дырэкцыя завода праяўляла палітычнае ратэйства ў адносінах да шкодніцкай работы ворагаў народу Вазнясенскі ні слова не сказаў.

Такі-ж апалітычны характар насіла выступленне члена парткома Глінлява. Гэты вузкі дзяляга больш усяго гаварыў аб сваёй вытворчай рабоце ў гаражы і толькі мімаходам закрануў асобныя пытанні партыйнай работы.

У большасці выступленняў адсутнічала вострая большэвіцкая крытыка работы парткома яго членаў сакратара. Больш таго, знайшліся нават падхалімы, якія ў сваіх выступленнях усхвалялі партком і яго сакратара Елецкага. Член партыі Вайсман, які два тыдні таму назад абвінавачваў партком у адарванасці ад комуністаў і няведанні ўмоў іх жыцця, на гэтым сходзе ўсхваляў сакратара парткома Елецкага, як быццам-бы, за чулыя адносіны да комуністаў. Гэта таму, што напярэдадні схода Вайсману была аказана матэрыяльная дапамога па пастанове парткома. Прасякнута было падхалімствам і выступленне члена партыі Глісенка, які таксама спяваў хвалебныя гімны па адрасу парткома і яго сакратара Елепкага.

Асобныя комуністы хоць і не зусім востра, але ўсё-ж крытыкавалі работу парткома, выкрываючы прычыны нізкага ідэйнага ўзроўню партыйна-масавай работы на заводзе. Член партыі тав. Гакман указала на слабое кіраўніцтва парткома палітычным выхаваннем комуністаў, асабліва кандыдатаў партыі. Для партыйнай вучобы комуністаў не складзены неабходныя ўмовы. У гуртках вывучэння гісторыі партыі не выкарыстоўваюцца творы Леніна і Сталіна, што адбіваецца на якасці вучобы і не дае магчымасці комуністам паспяхова авалодваць большэвізмам, каб быць палітычна празорлівымі і ўмець распазнаваць ворагаў, пад якой-бы маскай яны ні хаваліся.

Кандыдат партыі Адумушка крытыкаваў слабое кіраўніцтва парткома заводскім хрукам.

Комуніст Рапецкі гаварыў аб тым, што партком зусім слаба прапаваў са спачуваючымі. Іх ніколі не збіралі на сходы. Многім спачуваючым партком не даваў ніякіх даручэнняў і не ўпягваў іх у работу; яны вельмі слаба падрыхтаваны да прыёму ў партыю. Кандыдат партыі Шэхман крытыкаваў партком за тое, што ён аларвався ад мас, не вывучаў жывых людзей і не ведае іх настрояў і запатрабаванняў. Ён прыводзіў факты нячулых адносін да рабочых з боку загалчыка механічнага цэха члена партыі Клішчэнка, які марыне заявы рабочых, не даючы на іх чоткія і ясныя адказы. Не атрымліваюць часамі ясных адказаў комуністы ў парткоме.

Палітычна завостраным было выступленне комуністкі Голікман. Яна крытыкавала не толькі партком, але і райком і акругком партыі за тое, што яны не аддавалі належнай увагі рабоце заводскай партарганізацыі. Тав. Голікман зусім правільна ўказала, што за нізкі ідэйны ўзровень партработы на заводзе адказвае таксама райком і акругком. Яны не выконвалі іх прамы абавязак дапамагчы партарганізацыі ўзмацняць палітычнае выхаванне, узнімаць палітычны ўзровень комуністаў.

Р. ФРАЛОЎ.

КРЫВАВЫЯ ЗЛАЧЫНСТВЫ ЯПОНСКІХ АКУПАНТАЎ НА ДАЛЕКІМ УСХОДЗЕ

Да падзей 4—5 красавіка 1920 г.

МЫ ГЭТАГА НЕ ЗАБУДЗЕМ

У 1918 годзе японскія імперыялісты, запепакоеныя пераможным ходам Вялікай Кастрычніцкай рэволюцыі ў Расіі, прабасоцыялістычнай рэволюцыі ў Расіі, прабавалі разам з імперыялістамі іншых краін, налажыць сваю драпежную лапу на Далёкі Ўсход. Забойства на владзівастокскай японскай канторы «Ісідо», справакаванае японцамі 4 красавіка 1918 года, самі-ж японцы зрабілі «повадам» да ўзброенага нападу на далёкаўсходнія рубяжы маладой совецкай рэспублікі.

На працягу двух год ішла крывапралітная барацьба дрэнна ўзброеных чырвоных партызан з рэгулярнымі арміямі японскіх інтэрвентаў і белагвардзейскімі полчышчамі, аснашчонымі замежнымі інтэрвентамі ваеннай тэхнікай.

У пачатку 1920 года, пасля разгрому калчакоўшчыны і інтэрвентаў Чырвонай Арміяй, гераічныя партызанскія атрады, кіруемыя партыяй большэвікоў, адзін за адным займалі гарады Далёкага Ўсхода. Белагвардзейскія полчышчы былі разбіты ўшчант. Інтэрвенты пакінулі Далёкі Ўсход. Працоўныя края радасна сустракалі сваіх вызваленцаў—праслаўленыя атрады чырвоных партызан.

Але японскія інтэрвенты не спынілі сваіх крывавых дзеянняў на далёкаўсходняй зямлі. 3 сакавіка 1920 г. ва Владзівастоку пачынаецца высадка ўсё новых і новых японскіх дэсантаў. Падрыхтоўваючыся да новага выступлення, японцы старанна імкнуліся скрыць свае захватніцкія мэты, спазеючыся ўсыпіць пільнасць рэволюцыйных войск.

2 красавіка 1920 года японскае камандаванне павяло мірныя перагаворы з часовым прымэрскім урадам. Днём 4 красавіка было дасягнута папярэдняе пагадненне, падпісанне якога было перанесена на 5 красавіка. А вечарам 4 красавіка ва Владзівастоку пачаліся падпалы, забойствы, грабяжы. Японскія інтэрвенты адмавілі акупацыю Далёкага Ўсхода. Яны выступілі амаль адначасова ва Владзівастоку, Нікольск-Ўсурыйску, Хабараўску, Шкотава, Раздольным, Спаску, Пасьёта і ў іншых гарадах і сёлах Прымор'я і Прыамур'я.

Ап'янёныя крывёю, японскія захватчыкі па-зверску забівалі мірных жыхароў—хворых, старых, дзяцей. Яны не шкадавалі нікога. У Хабараўску японцы падпалілі казарму, дзе знаходзіліся хворыя і раненыя байцы. Кожнага, хто імкнуўся выбрацца з пылаючага будынка, японцы прыкладамі заганялі назад. Інтэрвенты абстралялі хабараўскую гарадскую больніцу, палілі і грабілі дамы мірных жыхароў, гвалцілі жанчын.

Воды Суйфуна і Амура афарбаваліся крывёю партызан і мірных жыхароў. Тысячы забітых і раненых, разграбленыя гарады і сёлы, сотні згараўшых будынкаў—вось крывавы вынік правакацыйнага выступлення японскіх імперыялістаў 4—5 красавіка 1920 года.

Японская ваеншчына яшчэ на працягу двух год прадаўжала свае крывавыя справы ў Забайкаллі і Прымор'і. У 1922 годзе гераічныя атрады партызан і байцоў народна-рэволюцыйнай арміі апракінулі ў Японскае мора апошнія астаткі акупантаў і белагвардзейшчыны, ачысцілі назаўсёды совецкую зямлю ад інтэрвентаў.

...«Кроў, багата пралітая нашымі людзьмі, не прайшла дарма...» (Сталін).

Совецкі Далёкі Ўсход, як і ўвесь наш Совецкі Саюз, з кожным годам становіцца ўсё больш магутным і моцным. Далёкаўсходні край карыстаецца вялікай любоўю ўсіх працоўных нашай радзімы. Ніколі не забудуць народы нашай краіны подлых, крывавых дзеянняў японскіх акупантаў на Далёкім Усходзе.

Вялікім быў народны гнеў, калі стала вядома аб страшэнных планах трацкісцкіх бандытаў, замышляўшых прадаць Японіі Прымор'е і Прыамур'е.

Совецкі народ ператварыў Далёкаўсходні край у непрыступную крэпасць, аб якую разаб'ецца ўсякі, хто адважыцца пасягнуць на граніцы нашай радзімы.

Дакументы аб японскай інтэрвенцыі на Далёкім Усходзе

ПРАЎДА АБ ХАБАРАЎСКУ

Напад японцаў адбыўся з поўнай неспадзяванасцю. Яны раптам алкрылі агонь па ўсяму гораду. Стральба пачалася амаль адначасова з вінтовак, кулямётаў, гармат. У якія-небудзь 5—10 мінут мірны горад ператварыўся ў суцэльнае пекла. Засігнутыя па-за сваімі жыллямі людзі беглі натоўпамі па вуліцах, падалі на зямлю, будучы забітымі ці раненымі японскім агнём. Японцы сапраўды не шкадавалі патронаў.

Гарматная кананада пягнулася з невялікімі паузамі да раніцы наступнага дня—6 красавіка.

Агонь японскай артылерыі быў галоўным чынам сканцэнтраван на ваеннай гары — месцы размяшчэння цэнтральных устаноў.

Быўшыя тут будынкі на чале з казённым корпусам і казармамі перагвораны снарадамі ў рэшата, або груду руін. У розных частках японцамі спалены некалькі дамоў.

Між іншым, спален дашчэнту дом, у якім змяшчаліся прафесіянальныя саюзы на чале з цэнтральным бюро і біржай працы. Уся маёмасць саюзаў і біржы загінула ў агні. Вуліцы Хабараўска 6 красавіка ўяўлялі сабой нешта жахлівае: усюды валяліся забітыя і раненыя. Падбіраць забітых і аказваць дапамогу стагнаўшым і спякаўшым крывёю сотням раненых, якія валяліся на бруку, тратуарах і сярод руін, першы час зусім не было каму. Ніхто не адважваўся ісці на вуліцу, дзе японскія кулі касілі ўсіх без разбору — ваенных, цывільных, старых і малых.

(«Красное знамя» № 80 ад 22 мая 1920 года).

Падрабязнасці падзей 4—5 красавіка 1920 г. у Раздольным

У Раздольным адбылося нешта кашмарнае. У ноч на 5 красавіка японскім камандаваннем былі запрошаны для перагавораў усе рускія камандзіры. Тыя з'явіліся ва ўказаны час і месца. Японцы вераломна напалі на іх і сталі бязлітасна расстрэльваць. Выратавалася бегствам толькі некалькі чалавек. Адначасова з гэтым японцы акружылі рускія казармы і пачалі кашмарны расстрэл салдат і мірнага насельніцтва пасёлка. Японскія салдаты былі пагалоўна п'янымі. Яны чынілі дзікую расправу над усімі, хто пападаўся ім пад руку. Літасці не было ні для жанчын, ні для дзяцей.

Расправа пягнулася цэлую ноч. Раніца застала страшную карціну разбурэння. Плошча была ўсеяна трупамі людзей і коней, дамы зрашэтаны вінтовачным і кулямётным агнём. Унутры многіх дамоў і ўстаноў ўсё разбурана, цэнасці раскрадзены.

У панядзелак японцы прыгналі ўсё прапазольнае насельніцтва бліжэйшых паселішч і прымусілі падбіраць трупы забітых.

(З газеты «Красное знамя» за 1920 г.).

Расстрэл за пабег

Начальнік японскай вайсковай каманды, якая складае ахову палонных чырвонаармейцаў у казарме № 20, заявіў, што будуць расстрэльваць за кожнага ўцёкшага аднаго з астаўшыхся ў палоне; калі ўцячэ палова, то другую ён загадае расстраляць.

(«Красное знамя» № 51 ад 16 красавіка 1920 г.).

Здзекі японцаў над арыштаванымі

НІКОЛЬСК-УСУРЫЙСКІ. Да сучаснага момаанту міліцыя не ўзброена, кормяць «заўтракамі», у 5 гадзін сёння збіраецца калчакоўская дума. Настрой у горадзе падаўлены, казённая маёмасць бязлітасна раскрадаецца, знішчаецца японцамі, гарань вакол горада цэлыя вогнішчы казённай маёмасці, раскрадзеных бібліятэкі. Ахова немагчыма за адсутнасцю ўзбраення і з прычыны процідзеяння генерала Одагіры.

Зняволеныя японцамі ў грамадзянскай турме і ў лагеры 5 палка афіцэры і салдаты трымаюцца ў неймаверна цяжкіх умовах, на хлебе і вадзе. Турма не апяляецца, арыштаваныя мераануць. Зносін з паветам амаль няма ніякіх, пошта і тэлеграф не дзейнічаюць. Згодна маючыхся неправерэных вестак, галоўная група нашых войск адступіла на Спаск.

Сёння атрымана аб арыштаваных японцамі салдат запіска, іх знаходзяцца пад арыштам у 5-м палку 1.500 чалавек у жахлівых умовах. Адзіночнікі прагулкамі не карыстаюцца, ім даюць па кубачку вады, камеры не апальваюцца. На апошняе японцы адказваюць, што няма дроў. Уся адміністрацыя турмы японская, за выключэннем двух рускіх назіральнікаў, пастаўленых, відаць, для шпіянажу.

(«Красное знамя» № 52 ад 17 красавіка 1920 года).

З заявы карэйскіх працоўных ва Владзівастоку

Карэйцы, якія пражываюць у Нова-Карэйскай слабодцы, 9 красавіка падалі мясцовым іншаземным консулам наступную заяву: «Мы, жыхары Нова-Карэйскай слабодкі, ужо на працягу некалькіх дзён перажываем рэпрэсіі з боку японцаў. Японцы спалілі дамы мірных жыхароў, магазін, школу і рэдакцыю карэйскай газеты. Былі арыштаваны нашы дзеці і маладзь, падвергнуты збіенню і ўведзены невядома куды... Мы просім зрабіць расследаванне дзеянняў японскіх салдат і ў будучым абараняць нас ад воснасцайтых рэпрэсій з боку японцаў».

(«Красное знамя» № 56 ад 22 красавіка 1920 г.).

Усе публікуемыя матэрыялы атрыманы з далёкаўсходняга гістпарта і краявога архіва і перададзены з Хабараўска па тэлеграфу. Стыль і арфаграфія дакументаў захоўваюцца без змены.

1902 | # ГЛЕБ ІВАНАВІЧ УСПЕНСКІ | 1937

ВЫДАТНЫ БЫТАПІСЕЦ

Выдатны рускі пісьменнік — публіцыст Глеб Іванавіч Успенскі жыў і працаваў у так званы пераформенны перыяд у гісторыі Расіі. Уладзімір Ільіч Ленін, аналізуючы гэты перыяд часу, пісаў: «Пасля 1861 года развіццё капіталізма ў Расіі пайшло з такой быстрынёй, што ў некалькі дзесяцігоддзяў адбываліся перавароты, якія занялі ў некаторых старых краінах Еўропы цэлыя стагоддзі». (Ленін, т. XV, стар. 143).

Рэформа 1861 года не вырашыла сацыяльных супярэчнасцей у Расіі, якія з асаблівай сілай і вастрынёй выявіліся пасля руска-турэцкай вайны 1855—56 года. Расія выйшла з гэтай вайны пераможанай і гэта прымусіла Александра II, пераступіўшага на трон пасля самагубства Нікалая I, шукаць выхаду са стварыўшагося становішча не ў знешніх авантурах, а ўнутры самой Расіі.

Але становішча народных мас рэформа нісколькі не палепшыла. Наадварот, расла дыферэнцыяцыя і яшчэ больш паўперызаваныя мас сялянства. У гарадах рост колькасці рабочага класа суправаджаўся катастрафічным падзеннем заработнай платы і жыццёвага ўзроўню працоўных мас.

На фабрыках і заводах пачынаецца бражэнне рабочых супроць непасільнай эксплаатацыі, бясправўнага становішча і паліцэйскага свавольства. У вёсцы ўсё часцей і часцей паўтараюцца выступленні сялян супроць памешчыкаў. Сяляне захватваюць землі і лясы, паляць маёнткі, забіваюць ненавісных эксплаататараў.

У гэтых умовах зараджаўся і вырас рух рускіх народнікаў, рух інтэлігенцыі, якая лічыла, што Расія ў сваім гістарычным развіцці пойдзе міма капіталізма, праз вясковую абшчыну прама да соцыялізма.

Глеб Іванавіч Успенскі па сваіх поглядах належаў да народнікаў. У сваіх творах ён адбіваў народніцкую ідэалогію. Ён асабіста быў звязан з ідэолагамі і правадырамі народніцтва (Міхайлоўскім і інш.).

Але, гаворачы аб тым, што Успенскі па сваёй ідэалогіі належаў да народнікаў, ні на адну мінуту нельга забываць указанне Уладзіміра Ільіча Леніна, што трэба разлічваць народнікаў першага перыяду іх руху, калі ў Расіі яшчэ слаба былі развіты капіталістычныя адносіны, калі народнікі чуваліся ліберал, калі яны «ішлі ў народ» і гэтым выказвалі пратэст супроць царызма, супроць эксплаатацыі сялянства, у абарону працоўных мас. І зусім іншае— народніцтва апошняга перыяду яго існавання, калі яно фактычна ослабляла барацьбу працоўных мас супроць царызма, хапела павярнуць кола гісторыі назад і супроць якога з усёй суровасцю і непрымірымасцю змагаўся Уладзімір Ільіч Ленін.

Глеб Іванавіч Успенскі належаў да першай групы народнікаў, у якіх сялянская дэмакратыя была адзіным рэальным зместам.

У першы перыяд сваёй творчасці — 1862—1865 гг. Успенскі пераважна асвятляе жыццё чыноўніцтва. На працягу наступнага дзесяцігоддзя ў яго творчасці сустракаюцца самыя рознастайныя тэмы: жыццё гарадской беднаты, становішча моладзі ў горадзе і ў вёсцы і т. д. Але росквіт яго, як таленавітага пісьменніка-публіцыста з усёй сілай праявіўся на асвятленні жыцця і быту сялянства.

1874—1877 г. падзяляецца рад нарысаў і апавяданняў, у якіх галоўнымі персанажамі выступаюць сяляне, прычым сяляне новага тыпу, высунутыя развіццём сацыяльных супярэчнасцей унутры вёскі.

Заслуга Глеба Іванавіча Успенскага і заключаецца іменна ў тым, што ў сваіх творах ён паказваў не «выключныя выпадкі жыцця», не «з раду вон выходзячыя здарэнні», а рэальную рэчаіснасць, прычым паказваў яе такой, якой яна ёсць у жыцці, у штодзённай рэчаіснасці.

Успенскі пайшоў значна далей народнікаў. Прыглядзеўшыся бліжэй да вёскі, ён убачыў у ёй дыферэнцыяцыю сялянства, г. зн. расслаенне на невялічкую кучку багацеяў — вясковай буржуазіі—кулакоў і масы разараючайся сялянскай беднаты, якая з развіццём капіталізма ўсё больш нішчае і колькасна павялічваецца. Успенскі, азнаёміўшыся з вёскай, ужо не верыць у самабытны шлях развіцця Расіі, не верыць, што Расія пойдзе міма капіталізма, праз абшчыну прама да соцыялізма. Ён гаворыць ужо, што «пан Купон» (так вобразна называе Успенскі капіталізм. Гэты вобраз ужывае і В. І. Ленін) гаспадарыць у Расіі. Тут ужо Успенскі паказвае тое, чаго не толькі не бачылі, але і не хацелі бачыць народнікі і за што апошнія выступалі супроць Успенскага.

Глеб Іванавіч Успенскі быў сучаснікам Карла Маркса. Ён прачытаў рад твораў асноваположніка навуковага комунізма. У 1886 годзе ў «Вестнике народной воли» № 5 і потым у 1888 годзе ў «Юридическом вестнике» № 10 было надрукавана пісьмо Карла Маркса рэдактару «Отечественных записок», напісанае ў 1877 годзе і не апублікаванае ды жыцці Маркса. Успенскі вельмі жыва адгукнуўся на гэта пісьмо. Ён напісаў спецыяльны артыкул па гэтаму поваду «Горький упрек», які між іншым, поўнасцю так і не быў апублікаван аж да 1929 года. У гэтым артыкуле Успенскі ўсхваляе Маркса, яго стыль і метад работы. Але з гэтага яшчэ не трэба рабіць вывад, што Успенскі — марксіст. Ён не стаў цалкам на пазіцыі марксізма.

У 1872 годзе Успенскі пабыў у Парыжы. Там яшчэ не астылі сляды лютых расправаў з парыжскімі комунарамі. І Успенскі з абурэннем піша аб катах, якія расправіліся з першай спробай устанавіць дыктатуру пролетарыята. Яго сімпатыі палкам і поўнасцю на баку парыжскіх комунараў.

Для нас, грамадзян Беларускай Совецкай Сацыялістычнай Рэспублікі, раней прыгнечанай, цёмнай і забітай калоніі царызма прадстаўляюць цікавасць погляды Успенскага на каланіяльную палітыку царызма. У «Пісьмах з дарогі» ён паказвае руйнуючую дзейнасць рускага капіталізма на Каўказе, паказвае Расію, як турму народаў, і выступае з абаронай прыгнечаных народнасцей Каўказа. Успенскі спачувальна адносіўся да ўсіх прыгнечаных народаў, выступаючы супроць агульнага іх ворага — царызма.

У творах Успенскага, у большасці прайшоўшых праз царскую цэнзуру, няма прамога заклику да ўзброенай барацьбы супроць царызма. Але з кожнага нарысу і апавядання гэты вывад напрошваецца сам. Ён паказваў становішча працоўных такім, якое яно было ў сапраўднасці, і выхад з яго толькі адзін — барацьба, барацьба бязлітасная і ўпартая супроць царызма, супроць усіх і ўсякіх эксплаататараў.

Уладзімір Ільіч Ленін у сваіх работах па аграрнаму пытанню шырока скарыстоўваў творы Успенскага. Уладзімір Ільіч паніў Успенскага за яго рэалістычны паказ жыцця, за яго праўдзівасць і чэснасць у апісанні жыцця сялянства.

Каб любіць наша радаснае і шчаслівае сёння і яшчэ больш цудоўнае заўтра, трэба ведаць тое праклятае мінулае, якое перажылі народы нашай радзімы. У гэтым на дапамогу нам прыходзіць з сваімі творамі Глеб Іванавіч Успенскі. Для нас ён мае вялікае значэнне, як багацейшая крыніца для знаёмства з жыццём і бытам сялянства ў мінулым.

Ф. КАНСТАНЦІНАЎ.



БІЯГРАФІЧНАЯ ДАВЕДКА

Глеб Іванавіч Успенскі нарадзіўся ў 1843 годзе ў сям'і правінцыяльнага тульскага чыноўніка. У 1856 годзе, пераехаўшы разам з бацькамі ў Чарнігаў, Успенскі вучыцца ў гімназіі і, скончыўшы яе, у 1861 годзе паступае ў Пецярбургскі універсітэт. Праз год з'яўляецца першае апавяданне пісьменніка «Міхалыч» у журнале Льва Талстога «Ясная паляна».

У 1863 годзе Успенскі пакідае універсітэт. Незабяспечаны матэрыяльна, ён пачынае пяжкае жыццё інтэлігента-пролетарыя. Першы буйны твор Успенскага — нарысы «Нравы Растеряевой улицы», звярнуўшыя ўвагу на таленавітага пісьменніка, пачаў друкавацца ў журнале «Современник» у 1866 годзе, але журнал быў закрыты царскім урадам і працяг нарысаў Успенскаму давялося друкаваць у выпадковых журналах. З 1868 г. Успенскі становіцца пастаянным супрацоўнікам журнала «Отечественные записки», які рэдагаваўся Некрасавым і Салтыковым-Шчэдрыным. У гэтым журнале на працягу 16 год Успенскі друкуе ўсе свае лепшыя творы.

У часе паездак за граніцу ў 1871 і 1874 гг. Успенскі зблізіўся ў Парыжы з адным з галоўных прадстаўнікоў тагачаснай рускай рэвалюцыйнай мысліі П. Л. Лаўровым. Успенскі быў сведкай расправы версальцаў над парыжскімі комунарамі і гэта на яго пакінула глыбокае ўражанне.

Захоплены народніцкімі ідэямі Успенскі ў 1877 годзе з сям'ёй пасяляецца ў вёсцы для бліжэйшага вывучэння сялянскага жыцця. З гэтага часу ён становіцца выдатным бытапісцам сялянства. У шматлікіх серыях нарысаў і апавяданняў пісьменнік праўдзіва, з выключнай сілай паказвае бесправеўнае жыццё тагочаснай вёскі, яе класавае расслаеванне, палівёны прыгнёт — з боку прыгоннікаў-памешчыкаў і развіваючагася капітала.

У 1887 годзе адзначаецца 25-годзе літаратурнай дзейнасці Успенскага. Самым каштоўным падарункам для пісьменніка было прывітальнае пісьмо 15 рабочых з Урала, якое сведчыла аб вялікай папулярнасці праўдзівых твораў пісьменніка сярод працоўных.

Апошняе апавяданне Успенскага «Полкидыш» было надрукавана ў 1893 годзе ў народніцкім журнале «Русское богатство». У гэтым-жа годзе пачала развівацца дуплёная хвароба пісьменніка. Успрыймальная натура Г. І. Успенскага не вынесла ўражанняў і асяродзяя змрочнай рэчаіснасці царскай Расіі. 6 красавіка (па новаму стылю) 1902 года Гл. І. Успенскага не стала.

КРЫНІЦА АЗНАЯМЛЕННЯ З МІНУЛЫМ

Творы Г. І. Успенскага я чытала яшчэ будучы вучаніцай сярэдняй школы. З не меншай цікавасцю я і цяпер перачытваю многія з іх.

Па яго творах я яскрава ўявіла сабе надзвычай пяжкае становішча сялянства і гарадской беднаты да рэвалюцыі. У кожным яго нарысе і апавяданні, дзе ён піша аб жыцці і быце селяніна, адчуваецца, што сімпатыі пісьменніка цалкам на баку працоўных, адчуваецца яго любоў да ўсіх эксплаататараў і прыгнечаных. Такія-ж пачуцці выклікае ён і ў сваіх чытачоў.

Творы Успенскага вельмі дапамаглі мне ярчэй уявіць сабе розніцу паміж пяжкім падняволеным існаваннем працоўных да рэвалюцыі і радасным жыццём цяпер — у нашай сацыялістычнай радзіме.

Ф. БЕРНАРДАВА, студэнтка БДУ.

Г. І. УСПЕНСКІ

БУДАЧНІК МЫМРЭЦОЎ

У нарысе «Будка», напісаным у 1868 г., Г. І. Успенскі, выводзячы вобраз будачніка Мымрэцова, увасобіў у ім усю жудасць самадзяржаўна-паліцэйскага рэжыма. Мымрэцоў — гэта сімвал тагочаснай расійскай паліцыйнай сістэмы. «Цягнуць» і «Не пушчаць» — два абавязкі, якія ведаў Мымрэцоў—характарызавалі сабой сістэму прыгнёту і падаўлення ўсякіх праяў творчых сіл, захаваных у нетрах народу. «Шыварат» — адзінае месца, па якім Мымрэцоў адрозніваў людзей ад жывёлы і за якое браў, каб адвесці туды, «куды рашуча не жадалі папасці, а не пускаў туды, куды гэтага смяртэльна жадалі».

Вобраз Мымрэцова стаў назоўным імем, якое не раз скарыстоўвалася ў рэвалюцыйнай літаратуры для бічуючай характарыстыкі царскага самадзяржаўя.

Ніжэй мы друкуем урывак з нарыса «Будка» — адзін з эпізодаў дзеянняў Мымрэцова.

Наогул таямнічыя ўласцівасці душы Мымрэцова зусім невытлумачальны, і мы, не маючы права рабіць вывады аб іх, проста пераходзім да яго дзейнасці.

Дзейнасць гэта, г. зн. пяганне і хапанне за шыварат, не спынялася ў Мымрэцова ні на адну мінуту; раніцай ён звычайна адпраўляўся ў часць і рапартаваў начальству аб сваіх поспехах, выкладаючы сваю прамову адпаведна сваёй знявечанасці і калецтву.

— Ну, — запытваў яго квартальны, перагортваючы нейкія паперы: — ты што-ж гэта там з бабамі ваюеш?

— Памілуйце, вашскародзіе, я толькі што адштурхнуў яе ад сябе.

— Каго?

— Гэту самую даму... Смаленскую...

— Якую Смаленскую?..

— Ды якая, напрыклад, шэльма сама... Гардзеіха загадвае яе ўзяць, а яна кажа: «Я, кажа, з гэтай дрэнню не пайду». Яна, вашскародзіе, мяне дрэнню назвала...

— Ну?

— Ну, я яе і адштурхнуў... кажу: «ты мне не патрэбна». А расаіраныя яны былі перш... Я палбег, яны ўжо разадраныя былі... і ўжо вока падбілі... у тым ліку...

— У якім ліку?..

— У ліку бойкі-с...

— Чорт пябе ведае, што ты гародзіш!.. Пасалзі?

— Памілуйце!

— Ідзі!..

Звычайна справа ішла такім чынам, што Мымрэцоў не паспяваў вярнуцца дамоў, як дзе-небудзь на шляху да будкі яму навярчвалася практыка; але іншы раз прама з часці ён прыходзіў у будку, расшпільваў шынель і, солдака паплёўваючы, курыў тутун. У гэтыя хвіліны ён не чуў, як жонка яго, завіхаючыся ля печы, лаяла яго па нейкаму выпадку і замахвалася на яго вілкамі; панура і маўкліва пенькуе ён махоркай; але калі махорка выгарала ў люльцы, і Мымрэцову прадставала неабходнасць абмежавацца сузіраннем узнасілае на яго галавой вілак, яму раптоўна рабілася сумна і тужліва; вышаўшы на вуліцу, ён трывожна пазіраў у адзін і другі бок, шукаючы нажыву, ізноў зварачваўся ў будку і пачынаў адчуваць, што ў яго балянь рукі, ногі, ныюць косці... Яму абавязкова патрабна было куды-небудзь спяшацца, лавіць што-небудзь або каго-небудзь. Лёг звычайна не доўга трымаў яго ў такім нуллівым стане.

Вось адкрыліся дзверы, у будку панясло холадам, і следам затым з'явілася постаць жанчыны ў пацёртай сіняй шубейцы, з тварам, залітым слязьмі і пакрытым пёмнымі нібы чарнільнымі плямамі. Слёз і плям дастаткова Мымрэцову, каб убачыць пад імі шыварат. Ён пачынае паспешліва зашпільваць шынель і гаворыць:

— Дзе? — намякаючы гэтым на месцазнаходжанне шыварата.

Яму не трэба ведаць, чаму і што? Ён даўно ўпаўніўся, што ў гэтых сляцах і сіняках нічога не разбярэ сам чорт.

— Ох, ды недалёчка, родны... — кажа старая. — Тут-ат-ка вось... да поля... Ужо і пакараў гасподзь... О-ох...

— Чому нам нельга дапускаць дабошу... — паспешліва гаворыць Мымрэцоў. — Дзе пясак?

— Ушхамір ты яго! Зрабі тваю міласць!..

— Палка дзе? Таму мы не дапускаем, калі, значыцца, шум, напрыклад... Нам гэтага нельга...

Палка знойдзена, і Мымрэцоў знікае, куды заклікае яго дуўт, а будачніца, ад няма чаго рабіць, займаецца высвятленнем прычыны сінякоў і слёз: яна ведае ўсё, што ні рабілася-б у ваколіцы.

— Сынок або не? — запытвае яна ў старой.

— Ох, не, родная, не сын! Няма сыноў. Зяць!

— Зя-ець?.. А то вось у суседзяў панажоўшчына ідзе — ну, там сыны...

— Зяць, зяць, родная!.. Кроўнае дзепішча аддала — загубіла. І быццам вораг мяне абышоў, як аддавала я!.. За ўдаўца аддавала! канакрад родная!.. Каторыя родныя ў той час былі, «што ты, кажуць, робіш? што ты ў друну яе зажыва кладзеш?» Дачку от... Не! Аддала... Прываба да яго ўжо вялікая была. «Век, кажа, карміць буду... да смерці... «Спакусілася, ды вось і выю... Толькі што, благаславі бог, павячалі іх, аж гляджу — ужо ён яе...

Пры гэтым старая зрабіла рукамі такі жэст, як быццам-бы хацела паказаць, як палюбіць блізну...

— Пасля гэтага ён нядоўга памучыў яе — у салдаты пайшоў, ахвотна... У той час мы з дачкой от усё бога малілі, каб яму галаву знялі прач... Усё, бывала, чаркесаў ды кізельбашаў гэтым паміналі ў малітвах — не ўтою, родная! Асталіся мы з дачкой, ды дзіцянё— трочкаю: дачка пайшла па партамыйнай часці, а я так на старасці з дзіцянём... Сама ведаеш, касатка, партамыйную часць. Пяпер вазьмі зімовы час — без перапынку на рэчцы, ля палонкі, рукі і ногі стынуць, ды зноў-жа цалы божы дзень сагнуўшыся — не лёгкая справа! Ужо яна, бывала, прыйдзе дамоў, у чым душа... у чым толькі душацька... А там, глядзіш, у нагу ўступіла, там у грудзях не пускае... Цяжка, цяжка было! Ну, усё жылі... Пяць гадоў гэтак мы мучыліся, і ў пяперашні час бога дзякаваць трэба... ходзім не ў лахманах, унучак мой таксама не без нагляду, чай п'ем кожны дзень, а па святках іншы раз і ў накладку, бывае, чай п'ем, Памаленьку! Толькі было ўзяліся, аж бог і прагневаўся... Крывяпіўна наш, Пілат, прышоў-жа! Гэтакая абразіна! Царыца нябесная... Глянула я на яго, як ён уночы да нас уваліўся — ды мяне быццам трасна якая схапіла... Дрыжу ўся. І дачка таксама дрыжань пачала... Дрыжым мы, што-ж ты зробіш... Стала я яго частаваць (сама ведаеш, галубка, «не для зяця сабакі, для мілага дзіцяці»...), а сама так вось і ўзлятаю. Хачу-хачу кубак яму падаць, а рукі ўгору, а сама я ў бок... Пырхаем з дачкой быццам перапёлкі... І слова вымавіць не магу: тра-ла-ла — толькі ўсяго: хоць вазьмі вось тапор ды адсячы язык — усё тое-ж самае. А Пілат наш заўважыў гэта. — «Што гэта, кажа, родзічы мае, не бічу я ў гутарках вашых сапраўднага парадку?.. Чым вам гэтак адзін аднаго з пог звальваць, лепш ты, пёшча, падпясі пан штоф віна»... Я, было, яму: «навошта вам, Максім Пятровіч, гэткую прорву віна? (ветліва стараюся)... Вы, кажу, чаго добрага, з гэткай пропасці пачнеце над намі мудраваць». — «Намер, кажа, мой такі, каб штоф»... Пайшла я, горачка мае, прынесла... П'е ён віно і дачку маю частуе. Ніколі віна ў рот не браўшы, вельмі яе растаміла.—«Сем, кажа, Максім Пятровіч, я прылягу, растаміла мяне»... Як лягла яна дык і заснула. Як ён, сударушка мая, убачыў яе ніхі прыемны сон, той-жа мінутаю схапіў яе і давай: —«ты, кажа, мяне не кахаеш... Муж прыйшоў, пяць гадоў не бачылася, а яна толькі закрапулася да паспелі і захрапела»... Я кінулася разнімаць, кажу: — «Што вы, што вы, Максім Пятровіч, вы гэтак насуліну пераб'еце... (ветліва з ім стараюся...) тут, кажу, на дзесяць рублёў дабра» — а ён усё яе...

Старая ізноў паўтарыла жэст паласкання бялізны і замоўкла, усхліпваючы.

У гэты час на вуліцы пачуўся крык і плач: расказчыца выбегла на ганак будкі і ўбачыла наступнае: пасярэдзіне дарогі ішоў Мамрышаў і цягнуў за сабой прачку, дачку расказчыцы. Панційскі Пілат, г. зн. салдат, ішоў ззаду жонкі і, падштурхоўваючы, гаварыў:

— Не, ты свіной ежы не прабавала— пакаштуй, паспытай не, матушка.

— Дзіцё! Дзіцё ў яго аднімце, — крычала прачка.

— За што-ж дачку? дачку маю за што? — не разумеючы, як усё гэта здарылася, крычала расказчыца.

— Раз-змаўляць! — адказваў на ўсе пытанні і просьбы Мымрэцоў, які зачапіў прачку таму, што яна першая падвярнулася яму пад рукі: ён падаўна вялаў, што ў кожнага з іх свая пасуліна. І, значыць, каго не схапіць з іх — усё адно і тое-ж.

Пераклаў Т. ХАДКЕВІЧ.

В. КОЗЬМІН

Творчы шлях Г. І. Успенскага

Трыццаць пяць год назад, 6 красавіка (н. с.) 1902 года, скончаўся адзін з таленавіцейшых рускіх пісьменнікаў другой паловы XIX стагоддзя — Глеб Іванавіч Успенскі.

Глыбокі рэаліст і тонкі назіральнік рускага жыцця, Успенскі ўмеў заўважаць у гэтым жыцці такія з'явішчы і тэндэнцыі, якія аставаліся скрытымі ад іншых. Глеб Успенскі ў сваіх творах даў надзвычай яркі і верны вобраз умоў жыцця і быту розных класаў рускага грамадства свайго часу. Недарма першыя рускія марксісты на чале з В. І. Леніным неаднаразова спасылаліся на назіранні Успенскага, чарпаючы ў іх пераканаўчыя довады ў сваёй ідэйнай барацьбе з народніцтвам.

Па свайму паходжанню Успенскі—сын правінцыяльнага чыноўніка, належаў да дробнабуржуазнай інтэлігенцыі. Перыяд яго інтэлектуальнага развіцця супаў з надзвычай важнай эпохай у гісторыі рускага грамадства — з эпохай разлажэння феадальна-прыгоннікага ладу. Расія, па выразу Леніна, рабіла першы крок на шляху ператварэння ў буржуазную дзяржаву. Светасузіранне Успенскага складалася ў гады палітычнага ажыўлення ў краіне, у гады росту сялянскіх паўстанняў і магутнага выступлення Чэрнышэўскага ў пачатак 60-х гадоў), калі на старонках «Современника» Чэрнышэўскі і Дабралюбаў выступілі з палкай пропаведдзю сялянскай рэволюцыі і карэннай перабудовы рускага жыцця. Ідэі Чэрнышэўскага і Дабралюбава, аказаўшыя велізарны ўплыў на погляды тагачаснай разначыннай інтэлігенцыі, адбіліся і на светасузіранні Успенскага. Пад іх уплывам ва Успенскім склаўся непрымірымая нянавісць да саслоўнага ладу, увасабляльніка-памешчыцкага ладу, уплыў якога Успенскі даў у асобе Мымрэцова, уся жыццёвая філасофія якога зводзілася да разуменняў «цягнуць» і «не пушчаць».

Развіўшыся ў гады палітычнага ажыўлення ў краіне, Успенскі выступіў у якасці актыўнага дзеяча літаратуры ў гады змяніўшага гэты ўздым панавання рэакцыі. Дабралюбаў да таго часу памёр. Чэрнышэўскі знаходзіўся ў зняволенні. Рэволюцыйныя арганізацыі, узніклыя ў 1861—1862 гг., былі разгромлены. Пад уплывам перамогшай рэакцыі значная частка інтэлігенцыі шарахнулася ўправа. Балезныя настроі галоў ажыўлення змяніліся маральным упадкам інтэлігенцыі.

У другой палове 60 гадоў Успенскі стварае два буйных творы, высунуўшых яго ў першыя рады тагочаснай літаратуры. Гэта — «Нравы Растеряевой улицы» і «Разорение». У абодвух гэтых творах, як і ў большасці дробных нарысаў і апавяданняў таго часу, Успенскі паказвае адно і тое-ж асяроддзе — свет гарадзкога беднага насельніцтва. Уражэнеп Тулы, Успенскі добра ведаў гэта асяроддзе, і гэта дало яму магчымасць надзвычайна ярка паказаць рознастайных прадстаўнікоў «абгаладанага класа». Гарадская галыцьба, рамеснікі, майстравыя і мяшчане, дробныя гандляры праходзілі перад чытачом у творах Успенскага. Усё іх жыццё зводзілася да работы, да адурэння за грашовага заработку. Шынок часта быў адзінай іх уцехай і забавай. Яны ў большасці пярпліва, пакорліва пераносілі свае нясцпчасці і поўнасцю прымірыліся са сваім лёсам. Рэформы 60 гадоў унеслі мала змен у іх жыццё. «Царства, прыжымкі» трымаліся непахісна. Змяніліся толькі формы ўціску. Маленькаму, прыдушанаму нястачамі чалавеку па-ранейшаму не было выхаду з яго пяжкага становішча.

Сярод герояў Успенскага гэтага часу яго творчасці асаблівую цікавасць уяўляе рабочы Міхаіл Іванавіч, зволены за працы ім бунтарскі рух. Міхаіл Іванавіч верыць у набліжэнне «вялікага патопа», гэта значыць рэволюцыі, якая пакладзе канец «парству, прыжымкам», але гэта яго вера не мае пад сабой рэальнай асновы, і сам Міхаіл Іванавіч не ведае, куль прыйдзе рэволюцыя, якую ён чакае.

Не менш пяжкае ўражанне пакідаюць і інтэлігенты, якіх малюе Успенскі. Гэта — або людзі, якія злучаюць «гуманства думак» з «дармаедствам паступкаў», або слабыя, бязвольныя, маральна няўстойлівыя людзі, здольныя толькі спачуваць чужым пакутам, але не змагацца з імі.

Убогае ў разумовых і маральных адносінах жыццё інтэлігенцкай абываталёўскай масы выклікала ў Успенскага агіду. «У Расіі можна жыць толькі ў вёсцы. Гэта цывілізаванае асяроддзе — сум жахлівы», — пісаў Успенскі ў 1876 годзе жонцы. Правёўшы ўсё сваё жыццё ў гарадах, Успенскі мала ведаў вёску і сялян. «Хітрая механіка народнага жыцця» аставалася, па яго ўласнаму прызнанню, чужой і незразумелай яму. Алгэтуль—яго рашэнне перасяліцца ў вёску, зблізіцца з сялянамі і вывучыць іх жыццё. «Сапраўдная праўда жыцця пацягнула мяне да крыніцы, г. зн. да мужыка», — пісаў Успенскі у сваёй аўтабіяграфіі ў 1878—1880 гг. На старонках «Отечественных записок» з'явіўся рад нарысаў Успенскага, пазней аб'яднаных пад агульнай назвай «Из деревенского дневника». У гэтых нарысах Успенскі выкладваў свае назіранні над сялянамі і іх жыццём.

Не шмат у рускай літаратуры твораў, якія пакідалі-б такое ўражанне на сучаснае Успенскаму грамадства, як яго «Из деревенского дневника». Гэтыя нарысы прывялі да абурэння прававерных народнікаў.

У чым-жа прычына гэтага абурэння на Успенскага і рэзкіх абвінавачванняў, якія пасыпаліся на яго галаву? У тым, што вясковыя назіранні Успенскага ішлі ўразрэз з традыцыйнымі народніцкімі поглядамі на вёску. Народнікі бачылі ва «ўстоях» вясковага жыцця самы надзейны аплот супроць утаражэння ў вёску капіталістычных адносін. Назіранні-ж Успенскага паказвалі, што грошы пачынаюць адыгрываць у вёсцы такую-ж ролю, як і ў горадзе, што капіталізм пранікае і ў вёску. Народнікі закрывалі вочы на дыферэнцыяцыю вёскі. Нарысы-ж Успенскага канстатавалі, што сялянства раскалваецца, што ў ім з'яўляюцца з аднаго боку багацеі — кулакі, лихвяры, спекулянты, якія трымаюць у залежнасці і жорстка эксплаатуюць працоўных сялян, а з другога боку беззямельныя пролетарыі, якія не маюць ніякіх сродкаў існавання. Народнікі глядзелі на сялянскую абшчыну, як на ўстанову, пабудаваную на пачатках вышэйшай справядлівасці і роўнасці ўсіх яе членаў. Успенскі паказваў, што абшчына ператварэцца ў паслухмяную зброю ў руках багацеяў і што яна не выратоўвае маламёмныя пласты сялянства ад разбурэння.

Характэрна, што рэакцыя народніцкіх «Отечественных записок», друкуючы нарысы Глеба Успенскага, паклапацілася аб тым, каб аслабіць іх значэнне і згладзіць ўражанне, пакідаемае імі на чытачоў. Для гэтай мэты побач з нарысамі Успенскага рэдакцыя друкавала «Деревенские былины» Златоўрацкага, аўтар якіх, не называючы Успенскага, адкрыта палемізіраваў з яго вясковымі назіраннямі. Мала таго, выдатнейшы тэарэтык народніцтва, адзін з рэдактароў «Отечественных записок» М. К. Міхайлоўскі палічыў неабходным «растлумачыць» значэнне нарысаў Успенскага, стараючыся па сутнасці ўсіляк паслабіць іх ураженні.

Успенскі не мог не адгукнуцца на рэзкія крытычныя заўвагі, выкліканыя яго нарысам. Ён палічыў неабходным уступіць у палеміку з прававерными народнікамі і ў першую чаргу сказаў нямала рэзкіх слоў па адрасу іх і іхніх «слюнявых» адносін да народу. Аднак крытыка народнікаў не прайшла для Успенскага без следу. Заадта шчыльна быў звязан ён з народніцкімі літаратурнымі коламі, заадта вялікім аўтарытэтам карыстаўся ў яго вачах Міхайлоўскі і пры перавыданні сваіх нарысаў «Из деревенского дневника» Успенскі выкрэсліў з іх найбольш непадыходзячыя з пункту гледжання народнікаў месцы, напрыклад, указанні на разрозненасць членаў сялянскай абшчыны, выпадкі супроць людзей, якія ідэалізавалі ўстойлівасць абшчынных парадкаў, указанні на тое, што гэтыя парадкі «зусім не пазбаўляюць членаў абшчыны ад галоднай смерці». Залежнасць Успенскага ад народніцкіх поглядаў з асаблівай сілай сказалася і на яго творах «Крестьянин и крестьянский труд» і «Власть земли», у якіх пісьменнік паказваў залежнасць не толькі ўсяго жыцця сялянства ад «зямлі» і земляробчай працы, а і даказваў, што сяляне, якія парываюць з зямлёй, асуджаны на маральную пагібель.

Аднак глыбокі рэалізм Успенскага дапамог яму вызваліцца ад уплыву народнікаў, і гэта сказалася на яго адносінах да капіталізма. Да сярэдзіны 80 гадоў усвядомленасці прышоў да ўпаўненасці ў неабходнасці нальходзячай ўрачыстасці капіталізма ў Расіі. Ён зразумеў, што на змену «ўладзе зямлі» прыходзіць «ўлада грошай». Вялікае ўражанне ў гэтых адносінах зрабіла на Успенскага вядомае пісьмо Маркса ў рэдакцыю «Отечественных записок», канчаткова ўпаўніўшае Успенскага ў наіўнасці надзей на тое, што Расіі ўласна выратавацца ад капіталізма. Успенскі прадбачыў будучую ўрачыстасць буржуазных парадкаў. Разам з тым ён прадбачыў, што ў будучым уладарству гэтых парадкаў прыйдзе канец.

Як мастак-рэаліст, Успенскі з надзвычайнай праўдзівасцю паказваў малюнкі рускага жыцця другой паловы мінулага веку. Веданне гэтага жыцця ва ўсіх яго супярэчнасцях адкрывала яму магчымасць скептычна адносіцца да ўладаўшых у яго час ілюзій. Адзін з ранніх рускіх марксістаў І. А. Гурвіч, адзначаючы надзвычайнасць народнікаў зразумець класавы антаганізм, параджаемы капіталізмам унутры сялянства, пісаў: «Глеб Успенскі адзінока стаяў са сваім скептыцызмам, адказваючы іранічнай усмешкай на агульную ілюзію. Са сваім выключным веданнем сялянства і са сваім вялізным артыстычным талентам, пранікаўшым да самай сутнасці з'явы, ён не мог не бачыць, што індывідуалізм зрабіўся асновай эканамічных адносін не толькі паміж ліхвяром і даўжнікам, але і паміж сялянамі наогул». Прыводзячы гэту цытату з Гурвіча, В. І. Ленін ахарактарызаваў яе, як «вельмі меткую» (збор твораў, том I, стар. 157—158).

Надзвычайная праўдзівасць, рэальнасць і закладнасць назіранняў Успенскага не толькі надаюць яго творам высокамастацкія дастоінствы, але і захоўваюць за імі значэнне ў вышэйшай ступені каштоўнай крыніцы для азнаямлення з рускім жыццём яго часу.

ЭПАР ПланСкан А2В
Питание
Линейная калибровочная мишень LRT-EN-V2

НА ФРАНТАХ У ІСПАНІІ

МАДРЫДСКІ ФРОНТ

ПАРЫЖ (сталіца Францыі), 3 красавіка. (БЕЛТА). Як перадае агенцтва Гавас з Мадрыда, у паведамленні камітэта абароны Мадрыда, апублікаваным днём 3 красавіка, гаворыцца:

«Учора ярасныя атакі мяцежнікаў у раёне Марата да Тахунья (у 30 клм. на паўднёвы ўсход ад Мадрыда) былі адбіты а вялікімі стратамі для мяцежнікаў.

У сектары Каруньскай дарогі (на поўнач ад сталіцы) рэспубліканцы прасунуліся наперад на два кіламетры ў напрамку Кольменар-Віехо-Тарэландонес.

***

ПАРЫЖ, 4 красавіка. (БЕЛТА). Як перадае агенцтва Гавас, 3 красавіка ў 22 гадзіны было апублікавана паведамленне камітэта абароны Мадрыда, у якім гаворыцца, што ў Мадрыдскім раёне рэспубліканскія войскі ўчарашнім захвачаныя ўчора пазіцыі, пануючыя над радам дарог на паўночны захад ад сталіцы, у тым ліку над Каруньскай дарогай. Артылерыя рэспубліканцаў разбурыла некалькі траншэй і кулямётных гнёзд праціўніка. Шматлікія перабежчыкі з лагера мяцежнікаў па-ранейшаму з'яўляюцца ў размяшчэнне ўрадавых войск.

ПАЎНОЧНЫ ФРОНТ

БІЛЬБАО (галоўны горад Баскскай аўтаномнай вобласці), 3 красавіка. (БЕЛТА). На біскайскім фронце, у сектары Очандыяно, на поўнач ад Вільяраяла, мяцежнікі, атрымаўшы ў падмацаванне матарызаваныя часці, пачалі наступленне на рэспубліканскія пазіцыі.

Рэспубліканцы, падпусціўшы на блізкую адлегласць фашысцкія часці алкрылі ўраганны агонь, прымусіўшы мяцежнікаў уцякаць. На полі бою мяцежнікі пакінулі тры ўзарваных бронемашыны, шмат раненых і забітых.

У раёне Горбеа (на паўночны захад ад Вільяраяла) мяцежнікі, прасунуўшыся наперад, былі акружаны рэспубліканскімі часцямі. Завязаўся бой, у рэзультаце якога мяцежнікі былі знішчаны. У гэтым баі рэспубліканцы захвацілі 4 кулямёты і некалькі дзесяткаў вінтовак.

Учора авіяцыя мяцежнікаў у колькасці каля 20 бамбардыроўшчыкаў і знішчальнікаў імкнулася бамбардыраваць Більбао. Пры з'яўленні рэспубліканскіх знішчальнікаў, выляцеўшых насустрач, фашысцкія самалёты пусціліся ўцякаць, не прыняўшы бою. Другая часць авіяцыі мяцежнікаў учора бамбардыравала мірнае насельніцтва гарадоў Дуранго, Очандыяно і Лекейтыо.

***

ЛОНДАН (сталіца Англіі), 3 красавіка. (БЕЛТА). Згодна паведамленням з Більбао, у аперацыях мяцежнікаў на біскайскім фронце прымаюць удзел італьянскія механізаваныя часці і авіяцыя, а таксама германскія самалёты.

На ўсім фронце наглядаецца перасоўванне мяцежных войск. Карэспандэнты лонданскіх газет лічаць, што ў бліжэйшым будучым разгарнецца буйныя баі. Карэспандэнты адзначаюць таксама, што ваенныя дзеянні адбываюцца ў супэльнай гарыстай мясцовасці і што таму нязначнае наступленне ўрадавых войск у раёне Вільяраяла не можа мець сур'ёзнага значэння, паколькі ўмовы мясцовасці палягчаюць абарону.

Камандаванне ўрадавых войск прыдае вялікае значэнне ваенным аперацыям на сантандэрскім фронце, дзе ідзе наступленне рэспубліканцаў на Бургос. Асабліва жорсткія баі ідуць ля Экскалады, прыкладна, у 55 кіламетрах на поўнач ад Бургоса (на шасейнай дарозе Бургос-Сантандэр). Пагроза Бургосу прымусіць мяцежнікаў перакінуць сюды часці, сканцантраваныя на біскайскім фронце.

ПАЎДНЁВЫ ФРОНТ

ПАРЫЖ, 3 красавіка. (БЕЛТА). Як перадае агенцтва Гавас, уралавыя войскі, развіваючы наступленне на захад ад поўдзень ад Пасабланка (на поўнач ад Кардовы), працаўжаюць захватваць ваеннае спаражэнне. У занятых рэспубліканцамі Алькарасехос і Вільянуэва галь Дуке большасць дамоў разграблена мяцежнікамі перад адступленнем. У траншэях, пакінутых праціўнікам, знойдзена шмат трупаў салдат, якія, відаць, былі расстраляны мяцежнікамі пры спробе ўцякаць.

НА ПОВАДУ Ў АГРЭСАРАЎ

ПАРЫЖ, 3 красавіка. (БЕЛТА). Газеты падкрэсліваюць, што на сесіі пастаяннага совета Малой Антанты (Чэхаславакіі, Румыніі і Югаславіі), выявілася жаданне Югаславіі адкласці абмеркаванне прапанавага нага Францыяй праекта пакта ўзаемнай дапамогі паміж Францыяй і дзяржавамі Малой Антанты. Югаслаўскі міністр замежных спраў Стаядыновіч заявіў, што заключэнне такога пакта несвоечасова і немэтазгодна, бо можа быць выцлумачана некаторымі краінамі як доказ існуючых «агрэсіўных намераў».

У французскіх афіцыяльных колах, лічаць, што матывы, высунутыя Стаядыновічам, — толькі ўвёртка, накіраваная на тое, каб не ўзяць на сябе абавязацельства праціўдзейнічаць Германіі, калі апошняя нападзе на Чэхаславакію.

Перад выбарамі ў японскі парламент

ТОКІО (сталіца Японіі), 3 красавіка. (БЕЛТА). Партыя «Сякай Тайсюто» (сацыял - дэмакратычная партыя Японіі) апублікавала перадвыбарныя лозунгі і платформу, з якімі яна выступае ў выбарах у ніжнюю палату. У галіне ўнутранай палітыкі «Сякай Тайсюто» высунула рад патрабаванняў агульнага характару.

У галіне знешняй палітыкі партыя «Сякай Тайсюто» патрабуе ўрэгулявання адносін паміж Кітаем і Японіяй, заключэння пакта аб ненападзе з СССР і заключэння пакта, які гарантуе бяспасны ціхаакіянскіх краін.

У платформе зусім не ўпамінаецца аб барацьбе з фашызмам ці нават з фашысцкімі тэнденцыямі, не ўпамінаецца таксама аб адзіным народным фронце.

У ДАПАМОГУ УСХОДНЯМУ ДРУГУ

Германскі друк адкрыта заклікае Японію ліквідаваць астаткі парламентарызма і ўстанавіць фашысцкую дыктатуру. Мал. Я. Кашкеля.



ТРЫУМФ СОВЕЦКІХ МУЗЫКАНТАЎ

БРУСЕЛЬ (сталіца Бельгіі), 3 красавіка. (БЕЛТА). Перамога совецкіх скрыпачоў на міжнародным конкурсе — ў цэнтры ўвагі бельгійскага друку.

Газеты змяшчаюць велізарныя партрэты совецкіх музыкантаў і адзначаюць клопаты совецкага ўрада аб музыкальных дараваннях. Газета «Этуаль Бельж» піша: «Будзем аб'ектыўны і скажам, што поспех совецкіх музыкантаў абумоўлен выключнай тэхнікай. Ойстрах і яго таварышы іграл з такім майстэрствам, што на карысць іх выказалася большасць членаў журы».

Газета «Лібр Бельжык», спыняючыся на апошнім дні конкурса, указвае, што совецкі скрыпач Фіхтэнгольц здзівіў аўдыторыю сваім пранікненым выкананнем канцэрта Брамса. Газета, маючы на ўвазе совецкіх музыкантаў, піша, што пераможцамі аказаліся іншаземцы, бо яны ў сваёй краіне карыстаюцца шырокім усебаковым падтрыманнем.

Газета «Дэрньер эр» надрукавала гутарку з Ойстрахам. Ойстрах спыніўся на сістэме музычальнай асветы і выхавання ў Совецкім Саюзе.

Паведамленне французскага морскага міністэрства

ПАРЫЖ, 2 красавіка. (БЕЛТА). Як перадае агенцтва Гавас, французскае морскае міністэрства, у сувязі з меўшымі месца выпадкамі затрымання французскіх параходаў караблямі іспанскіх мяцежнікаў, апублікавала паведамленне, у якім указваецца, што ўсе французскія ваенныя караблі атрымалі распараджэнне прыйсці на дапамогу французскім гандлёвым параходам у выпадку, калі яны будуць затрыманы ў адкрытым моры. Французскім ваенным караблям прапанавана не дапускаць затрымання французскіх параходаў.

Міжнародная хроніка

⊙ Французскі контрмінаносец, галандскі крэйсер і англійскі эсмінец безупынна патрулююць Гібралтарскі праліў (праліў паміж Піранейскім поўвостравам і Паўночнай Афрыкай) у раёне Сеуты і Тарыфы.

⊙ Польскія газеты паведамляюць аб арышце 120 асоб у Лодзі (Польшча) па падазрэнню ў рэвалюцыйнай дзейнасці. Большасць арыштаваных з'яўляюцца членамі забароненага ўладамі профсаюза будаўнічых рабочых.

Адначасова лодзінскімі ўладамі распушчаны профсаюзы рабочых шкёнай прамысловасці, хімікаў і бактэрыёлагаў.

⊙ Толькі што вышаўшы германскі штотыднёвік «Вірташафт унд статыстык» публікуе статыстычныя даныя аб далейшым вялікім скарачэнні дапамог на беспрацоўі ў Германіі. Згодна папярэдніх разлікаў, за 1936—1937 бюджэтны год выдача дапамог па беспрацоўі складала ўсяго 300 мільёнаў марак, г. зн. на 211 мільёнаў менш у параўнанні з мінулым годам. За апошнія 4 гады асігнаванні на дапамогі па беспрацоўі ў Германіі скарочаны больш чым у 4 разы.

⊙ Орган германскага ваеннаморскага ведамства «Марынэ ферорднунгсблат» паведамляе аб увядзенні ў строй германскага ваеннаморскага флота 12 новых пасыльных суднаў.

⊙ Па распараджэнню данцыгскага сената ў Данцыгу ўводзяцца прымусовыя работы для беспрацоўных. Прадугледжана магчымасць пасылкі беспрацоўных на прамысловыя работы ў Германію.

⊙ Акруговы суд у Пазнані (Польшча) вынес прыгавор па справе трох асоб, абвінавачаных у камуністычнай дзейнасці. Адзін абвінавачваемы прыгаворан да 10 год турэмнага зняволення, а два другіх абвінавачваемых — да 6 год кожны.

⊙ Як паведамляюць з Ганконга (англійская калонія ў Кітаі), англійскія ўлады адпускаюць 8 мільёнаў фунтаў стэрлінгаў (фунт стэрлінгаў — каля 25 руб.) на рэканструкцыю ўмацаванняў Ганконга. Будуць пабудаваны два новыя форты, устаноўлены новыя пяхкія гарматы і павялічан лік самалётаў.

КРЫЎДА МАРЫІ ШЫРОКАЙ

ПЕТРЫКАЎ. (Спецкар. «Звязды»). У петрыкаўскай раённай больніцы вось ужо каля двух месяцаў ляжыць прыкаваная хваробаю да пасцелі работніца цэха шырпатрэба канцэвіцкага фанернага завода «Звязда» Петрыкаўскага раёна тав. Марыя Іосіфаўна Шырокая. Пяжкое нервовае захворванне адняло ў яе левую частку тулава і нагу. Яна не можа рухацца і вельмі аслабла. Жанчына, дзень стрымліваючы хваляванні і слёзы, расказвае нам сваю крыўду.

Калі Марыя Шырокая была здаровай, яна была цэнтрам увагі ўсяго калектыва завода. Заліваўся дыфірамбамі па адрасу стаханаўкі Шырокай, якая выконвае тры нормы, дырэктар завода Трахімус. Марыя Шырокая — член партыі. Сакратар парткома Кароль лічыў сваім доўгам ставіць яе ў прыклад іншым. Ад іх не адставаў і старшыня заўкома Праходзька.

Але вось са стаханаўкай членам партыі, здарылася няшчасце. Яна захварэла. Тав. Шырокая звярнулася да старшыні заўкома Праходзька праластавіць ёй падводу да петрыкаўскай райбольніцы (20 кіламетраў).

— Наймі падводу і паязджай,—халодна і груба адказаў гэты прафбюракрат.

Гэтым адказам Праходзька поўнасцю захарактарызаваў агідныя адносіны да людзей з боку кіраўніцтва завода. І сапраўды, як толькі Марыя Шырокая лягла ў больніцу, пра яе забылі, як быццам не было чалавека на свеце. Хворай жанчыне хапелася-б ад каго-небудзь з таварышоў пачуць цёплае слова, ведаць, што робіцца ў калектыве. Але нікому з капцэрнікіх бюракратаў не прышла ў галаву думка наведаць сваю-ж перадавую рабоўку, члена партыі. Да таго-ж тав. Марыя Шырокая адзінокая жанчына, не мае тут сваякоў, і тым больш пяжка адчувае вадаць сваё адзіноцтва ў становішчы хваробы.

Нарэшце, аднойчы, па яе просьбе, сакратар парткома Кароль прынёс належачыя ёй грошы. Не паспела яна яму і трох слоў сказаць, як ён, спяшаючыся да выхаду, роўнадушным тонам кінуў:

— Няма часу, спяшаюся...

З таго часу прайшлі для Марыі Шырокай цяжкія дні, тыдні і вось ужо другі месяц хваробы. Ёй не верылася, што нікога не пікавіць яе лёс. Думалася, вось-вось хто-небудзь ды загляне. Але ўсе чаканні дарэмны. Днямі ў Петрыкаве тры дні сядзеў дырэктар завода Трахімус і два дні сакратар парткома Кароль. Але гэтыя бяздушныя людзі нават не падумалі наведаць хворую. Калі тав. Шырокая даведалася аб гэтым, яна заплакала ад крыўды.

І, нарэшце, аб хваробе члена партыі і адной з лепшых стаханавак у раёне ведае і РК КП(б)Б. Больнічныя ўрачы прасілі асабіста сакратара райкома Арашчука забяспечыць хворую пупёўкай на курорт. Арашчук выслухаў халайніцтва, спачувальна даў згоду і зноў забыў аб хворым чалавеку. І з райкома ніхто не заглянуў да хворай, ніхто не пацікавіўся ў чым яна адчувае патрэбу.

Н. ГАСМАН.

Пісьмо мастака М. Шагала

Вядомы рускі жывапісец і графік, ураджанец горада Віцебска, які жыве ў Парыжы з 1910 г., Марк Шагал прыслаў рэдакцыі менскай яўрэйскай газеты «Окпябр» пісьмо з повану смерці старэйшага мастака Беларусі Ю. М. Пэна.

У гэтым пісьме Марк Шагал піша: «Не магу супакоіцца і не ведаю як выразіць глыбокі смутак нечаканай жорсткай смерцю Ю. М. Пэна. Як я зайздрошчу ўсім вам. Вы маглі быць на яго пахаванні, хадзіць па нашай зямлі за яго труной і паветра неба, таго самага неба, якое я так часта стараўся перадаць на сваіх карцінах, абвалаквала вас. Чаму гэта паветра не даходзіць да мяне — сюды ў беспаветраным прасторы? Чаму лёс раздзяліў мяне на дзве часткі — цела тут— душа там?

А я пеставаў сябе надзеяй яшчэ ўбачыцца з Пэнам, быць у сваім горадзе, хадзіць з Пэнам зноў на эцюды, як раней, і зноў і зноў пісаць пра наш ужо адроджаны горад.

Зразумела, рэволюцыя адрадзіла другіх, новых неспадзяных «сваякоў», але я хачу перадаць для Пэна гэтыя некалькі слоў. Пэн-жа мяне любіў. Гэта любоў яго цягнулася вось ужо 30 год з моманту, калі я стаў самім сабой, не гледзячы на розгасць нашых мастацкіх шляхоў. Ён быў маім першым хопь і кароткачасовым настаўнікам. Я быў з яго першых вучняў і ён ведаў, што хоць я і жыву ў Парыжы ўжо з 1910 года з невялікімі перарывамі, я ўсё-ж душэўна астаўся адданы маёй радзіме, што паказаў як мог у сваім мастацтве.

Няма столькі фарб і засумаваных адценняў, у якія-б я хацеў завярнуць сваё апошняе прывітанне Пэну».

АДКРЫЦЦЁ ЛЕТНЯГА СПАРТЫЎНАГА СЕЗОНА БССР

Адкрыццё летняга спартыўнага сезона 1937 г. назначана на 6 мая. З гэтага года адкрыццё сезона становіцца масавым традыцыйным святам спартсменаў і фізкультурнікаў Беларускай рэспублікі. Да гэтага тэрміну павінны быць падрыхтаваны і адкрыты для масавага абслугоўвання фізкультурнікаў, дзяцей і ўсіх працоўных усе стадыёны, спортпляцоўкі, тэнісныя корты, велабазы, грабныя і водныя станцыі.

ШКОДНАЯ КАРЦІНА НА ЭКРАНЕ

З 1 красавіка ў Менску зноў (у кіно «Спартак») пачаў дэманстравацца фільм «Антэк паліцмейстар».

Гэта на жаль, не першакрасавіцкі жарт, а сумная сапраўднасць. Фільм «Антэк паліцмейстар» (замежнай вытворчасці), як шкодны, зусім не быў дапушчан на экраны Масквы. Аднак яго пратуліла Белдзяржкіно. Ён адзін час паказваўся ў кінотэатрах Менска. Але наш совецкі глядач хутка разабраўся ў шкодным карціне і не стаў яе глядзець. Карціну знялі.

Зараз дзяльцы з Белдзяржкіно чамусьці зноў яе выпусцілі на экран. Гэта выклікае зусім справядлівае абурэнне глядачоў.

СТВОРАНА ГАРАДСКАЯ ПЕРШАМАЙСКАЯ КАМІСІЯ

Пад старшынствам намесніка старшыні менскага горсовета т. Драбышэўскага ў Менску створана гарадская першамайская камісія. Камісія прыступіла да работы. Зараз распрацоўваецца план святкавання ў Менску міжнароднага свята працоўных Першага мая. План будзе гатоў 7 красавіка. Створаны 3 гарадскія раённыя першамайскія тройкі пад старшынствам культпропаў райкомаў КП(б)Б.

СЕННЯ Ў ТЭАТРАХ І КІНО:

БДТ-1 — **«Капітанская дачка»**, абанем. № 75; Тэатр оперы і балета—**Кармэн**, абанем. № 10; **«Чырвоная зорка» — Дэпутат Балтыкі**; «Пролетарый»—**Зоры Парыжа**; «Інтэрнацыянал»—**Варожыя сцежкі**; Дзяцячы кінотэатр—**Дзеці капітана Гранта.**

ГАЛОЎНЕЙШЫЯ МОМАНТЫ АГРАТЭХНІКІ*)

Акад. Я. АФАНАСЬЕЎ

Мульчыраванне. За апошнія гады ў стаханаўскіх звеннях калгасаў сталі з вялікім поспехам прымяняць мульчыраванне насеваў ільну, зернавых і іншых культур. Пасля пасеву паверхня пакрываецца здрабнёным нізінным торфам (60—80 тон торфу на гектар).

Прыбаўка ўраджаю ячменю ад мульчыравання на суглінстых глебах дасягала да 5 і нават 10 цнт. на гектар (Шклоўскі раён). На супясчанай глебе ўраджай аўса без мульчыравання 6—8 цнт. з гектара, з мульчыраваннем — 13,5 цнт. Па ўгноенаму фону (азотам, фосфарам і каліем) без мульчыравання — 16 цнт., з мульчыраваннем—21 цнт. з гектара.

Мульча заспярагае глебу ад высыхання, што асабліва важна на лёгкіх глебах і ў засушлівыя вёсны, а ўсходы тут бываюць дружнейшыя і раўнейшыя. Прысыпка торфам паверхні глебы засцерагае яе ад утварэння скарынак, што асабліва каштоўна на пяжкіх і заплываючых глебах. Далей, рассыпаны торф добра праветрываецца, у ім пасяляюцца мікраарганізмы і раскладаюць яго, а пажыўныя вяшчэствы, якія ў рэзультаце атрымліваюцца выпадаючымі дажджамі, умываюцца ў глебу і, значыцца, непарыўна жывяць расліну.

Канюшына, лубін і іншыя бабовыя расліны абагачаюць глебу азотам. Навукай даказана выяўлена, што на карэнніх канюшыны, як і іншых бабовых раслін, развіваюцца асобныя бактэрыі, якія маюць здольнасць засвойваць азот прамо з паветра і накапляць яго ў выглядзе жалвачкоў, бародавак на карэннях раслін. Гэтым азотам у першую чаргу карыстаюцца самі-ж бабовыя расліны, у сілу чаго яны могуць дастаткова добра развівацца і на бедных азотам глебах.

Аднак накоплены азот на карэннях бабовых раслін далёка не поўнасцю спажываецца імі самімі. Значная частка азоту астаецца ў карэннях, якія, перагніваючы, абагачаюць азотам глебу. Такім чынам, бабовыя расліны, у адрозненне ад іншых, не толькі не выпусташаюць глебу ад азоту, а наадварот, заметна накапляюць яго ў ёй.

Вядзенне правільных севазваротаў з абавязковым канюшынасеянням павінна стаць у нас асноўным законам культурнага земляробства. Для забеспячэння насенным матэрыялам кожны калгас і соўгас асобай пастановай урада абавязваюцца мець у сваёй гаспадарцы ўласны насенны ўчастак, за якім неабходны асобны нагляд.

Не менш пачэснае месца пры акультурванні глеб і пры абагачэнні іх арганічнымі вяшчэствамі і азотам у нас павінна быць адведзена лубіну на зялёнае ўгнаенне. Пры добрых ураджаях лубін дае зялёнай масы да 30—40 і звыш тон на гектар і пры заворцы палкам можа замяняць гной.

Лубін можа расці на самых рознастайных глебах і яго вельмі выгодна культываваць як на лёгкіх, так і на больш звязных глебах. Асабліва каштоўнасць яго там, дзе іншыя бабовыя развіваюцца слаба, гэта — на пясках. У апошнія гады лубін на сухіх і мокрых пясках Палесся, а таксама і ў іншых раёнах цэнтральнай паласы пачынае заваёўваць сваё месца на палях калгасаў. Аднак гэтага яшчэ далёка недастаткова. Лубін на пяшчаных палях павінен увайсці ў пастаянае звяно севазвароту, як канюшына на больш звязных глебах. Лубін звычайна з большым поспехам пасяваюць вясной для зернавых, пасля ўборкі якіх лубін паспявае нарашчваць добрую масу, якая позна восенню і заворваецца.

Пры асваенні цяжкіх хмызняковых зямель лубін аказаўся вельмі добрым сідэратам. Тут асабліва каштоўна, што лубін можа добра развівацца ў першы год удзыму застаралых і замшэлых хмызняковых лугоў на цяжкіх пазолах. Гэта дае магчымасць пакідаць падняты пласт не ў выглядзе чыстага папару, калі яны заплываюць, ушчыльняюцца, а займаць лубінам, які да восені накапляе для заворвання добрую зялёную масу і такім чынам значна паскарае асваенне і акультурванне зямель. Сеяралла і пялюшка, апрача таго, што ўзбагачаюць глебу азотам, з'яўляюцца вельмі добрымі кармавымі травамі. Сеяралла ў гэтых адносінах па справядлівасці лічыцца такой каштоўнай кармавой культурай, якая на пясчаных глебах можа замяніць канюшыну.

Сеяралла — аднагадовая трава і сеецца як на паравых палях, так і ў выглядзе падсеву да зернавых. Угнаенні пад пасевы сеяралы рэкамендуюцца прыкладна тыя-ж, што і пад лубін.

Асноўная запраўка ўгнаеннямі і падкормка. У практыцы сельскай гаспадаркі юўгі час панавала такое правіла ўнясення ўгнаенняў: уся вызначаная маса ўгнаенняў уносілася палкам і толькі да пасеву культур (восенню або вясной): у час-жа самога росту культур ніякіх угнаенняў не давалася.

За апошнія 2—3 гады ўстаноўлен і шырока практыкуецца перадавымі калгасамі новы, больш дасканалы спосаб гэта падкормка глебы пасля пасеву і ў час росту культур.

Канюшына пры падкормцы ранняй вясной (перад барапаваннем яе) суперфасфатам і калійнай соллю павялічыла ўраджай сена на 28 цнт. з гектара, пры агульным сборы сена з аднаго ўкоса звыш 70 цнт. з гектара.

Вопыт з аўсом на супясчаных глебах даў без угнаенняў 6—8 цнт. з гектара. З падкормкай поўным мінеральным угнаеннем (сульфатамоній, суперфасфат і калійная соль—па 60 кгр. на гектар, унесеных праз месяц пасля сяўбы) ураджай атрымаўся 16 цнт. з гектара.

Падкормка звычайна ўносіцца ў адсін або два прыёмы ў залежнасці ад віду культур і становішча іх росту. Так, азімыя культуры і шматгадовыя травы патраебуюць ўгнойваць рана вясной, бо толькі можна баранаваць іх, прычым угнаенні ўносяць перад самым баранаваннем. Да першай падкормкі зернавых яравых прыступаюць (праз 2—3 тыдні пасля ўсходаў (фаза кушчэння) у ільну — ў першыя росту ў клёку; у сояльны — пры пачатку ўсходаў. Другая падкормка праводзіцца ў зернавых у першай выхадзе ў трубку, у ільну — перад бутанізацыяй і ў бульбы—перад першым акучваннем.

Аб прыёмах запраўкі ўгнаеннямі. Арганічныя ўгнаенні, як гной, торф, розныя кампосты, заворваюцца пад плуг. Але тут нярэдка парушаецца асноўнае патрабаванне — роўнамернасць іх размеркавання і глыбіня запраўкі. Ад няроўнага размеркавання атрымліваецца вялікая стракатасць, пятністасць росту культур і агульнае зніжэнне ўраджаю. Таму перад запраўкай гэтых угнаенняў неабходна асабліва старанна і роўна размеркаваць іх на паверхні ворыва, а потым зараз-жа заворваць, не даючы амічным злучэнням выпарвацца ў паветра і перасыхаць масе.

Глыбіня запраўкі мае вялікае значэнне. Неабходна, каб арганічныя вяшчэствы трапілі пад вільготны і праветрываемы пласт і былі дастаткова і поўнасцю прыкрыты зямлёй, толькі тады разлажэнне іх будзе адбывацца належным чынам. Гэта звычайна дасягаецца тым, што на больш звязных глебах заворванне робіцца на глыбіню да 15 см., а на лёгкіх — на 18—20 см.

Пры павярхоўным унясенні валкіх арганічных угнаенняў (розныя жужы) важна зараз-жа іх заправіць бараной, або культыватарам, інакш у сухое надвор'е могуць стварацца шкодныя салявыя скарынкі.

Запраўку цяжка распушчальных угнаенняў (як фасфарытная мука, вівіяніт, вапна і т. д.), безумоўна, трэба рабіць плугам пад сяўбіва і пры ворыве папару.

Больш распушчальныя віды мінеральных угнаенняў у існуючай практыцы запраўляюцца па-рознаму: часцей — пад барану, радзей — пад плуг.

На моцна падзолістых глебах, пяжкіх суглінках, у залежнасці ад спосабу запраўкі ўгнаенняў (у лозах 30 кгр. на гектар кожнага віда ўгнаенняў, па фону гноевага ўгнаення) ураджай зярна ячменю быў такі:

Без ўгнаення, унесенае пад барану — 21 цнт. з гектара. Палова пад барану, палова пад плуг — 23 цэнтнеры з гектара. Дзіўны вопыт паказаў, што ўраджай аўса на тых-жа глебах (без фону гноевага ўгнаення, з мінеральнага ўгнаенні ўзяты ў колькасці 15 кг. на гектар).

Усе ўгнаенні, унесеныя пад барану, далі 15,2 цнт. ураджаю з гектара: — усе ўгнаенні, унесеныя пад плуг — 17 цэнтнераў з гектара, а палова ўгнаення, унесенага пад плуг і палова пад барану — 18,3 цэнтнера.

Асобнымі вопытамі ўстаноўлена, што азот, сульфатамоній здольны перасоўвацца, тады як фосфар і калій даволі трывала замацоўваюцца (паглынаюцца) у тым пласту глебы, куды яны ўносяцца пры заделцы. Значыцца, пры заделцы фосфара і калія бараной яны астаюцца галоўным чынам толькі ў верхнім і прытым невялікім пласту 6—8 см. магутнасці. А так як гэты павярхоўны і мелкі пласт нярэдка перасыхае, то, па-першае, тут могуць стварацца высокія канцэнтрацыі салявых растворaў, якія будуць шкодныя для прарастаючага насення і для карэнняў маладых раслін.

Далей ёсць і другая акалічнасць, а іменна: па меры развіцця карэнні ідуць у глыб глебы, і пры мелкай заделцы ўгнаенняў карэнні не сустрэнуць там унесеных угнаенняў. Вось чаму заделка ўгнаенняў пад барану дала найменшы эфект.

Прыместна, іншы атрымліваецца малюнак жыўлення раслін, калі ўгнаенні ўносяцца глыбей — пад плуг або пры камбінаванай заделцы. У гэтых выпадках перш за ўсё зніжэнне небяспека высокіх канцэнтраваных салей у пласту, дзе ляжыць насенне і развіваюцца маладыя карэнні раслін. Нарэшце, пры камбінаваным унясенні ўгнаенняў, апошнія размяркоўваюцца параўнаўча ў вялікім пласту да 20 см. і глыбей. Вось чаму заделка мінеральных угнаенняў пад плуг аказалася эфектыўней, чым пад барану, а камбінаваны прыём даў найбольш высокую прадукцыйнасць.

Апрацоўка глебы пад пасеўныя культуры для свайго поўнага і багатага развіцця патрабуюць не толькі наяўнасці ў глебе спажыўных вяшчэстваў, але азначасова адчуваюць патрэбу ў дастатковай прысутнасці ў глебе вільгаці і паветра. Апрача таго глеба павінна быць добра пранікальна для карэнняў раслін, г. зн. пухкай і структурнай (камкаватазярністай будовы), а таксама чыстай ад пустазелля. А ўсё гэта дасягаецца толькі добрай і своечасовай апрацоўкай.

Апрацоўка глебы зусім неабходна і для таго, каб у ёй накапляліся спажыўныя вяшчэствы, а галоўнае — былі-б у даступнай для раслін форме.

Рэгуліраванне ў глебе вільгаці, паветра, знішчэнне пустазелля, стварэнне пухкасці і структурнасці глебы і нахапленне ў ёй добрадаступных для раслін спажыўных матэрый — усё гэта дасягаецца не адным якім-небудзь прыёмам, а цэлай паслядоўнай сістэмай апрацоўкі — летам, увосень і вясной.

Вясновая перадпасеўная апрацоўка глебы. Глебы суглінстыя і гліністыя звычайна з вясны бываюць збытчана абвільготненымі, заплыўшымі і ўшчыльненымі. Такую глебу вясной абавязкова патрэбна пераарэць. А каб глеба пасля пераворвання не перасыхала, следам праводзіцца баранаванне.

Глебы больш лёгкія (пясчаныя, супесі) наадварот, адчуваюць патрэбу ў накапленні і захаванні вільгаці. Пераворванне зяблівы такой глебы звязана ў іх з вялікай стратай вільгаці, што можа ўплываць на значнае зніжэнне ўраджаю, і таму тут пераворванне вясной не дапускаецца. Тут дастаткова бывае толькі баранаванне або культывацыя.

Пачатак палявых работ і сяўба, як правіла, павінны быць усюды раннімі і праводзіцца ў самыя спісныя тэрміны. Парушэнне яго пяжка адбіваецца на зніжэнні ўраджаю ад нястачы вільгаці, ад хваробы раслін, ад спазнення высявання культур і т. д.

Аднак пры раннім ворыве і сяўбе не трэба забываць адно важнае агратэхніка: да апрацоўкі прыступаць тады, калі глеба праветрылася ад лішку вільгаці, або, як гаворыць, паспела. У гэты час глеба не мажацца, не прыліпае і не забівае апрацоўчых прылад, не адвальваецца суцэльным пяжкім пластом, а наадварот—дастаткова рыхліцца, разбіваецца і добра рассыпаецца пры ворыве. Такі момант падрыхтаванасці глебы да апрацоўкі і сяўбы патрэбна ўлавіць і не прапусціць. Асаблівую ўвагу патрэбна звярнуць на якасць апрацоўкі і сяўбы.

У кожным калгасе і соўгасе трэба арганізаваць прыёмку апрацаванай для сяўбы і засеянай плошчы. Прыёмку работы павінны праводзіць у калгасах пасяўрадна старшыня, а ў соўгасах старшы агранам або кіраўнік аддзялення.

*) Працяг. Пачатак гл. у «Звязде» за 4 красавіка 1937 г.

Уп. Галоўлітбела № А—694.

Друкарня газеты «Звязда». Менск, Совецкая, 53.

Адказны рэдактар Д. В. ЮРКОЎ.

К. К. С.